Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СНЕЖНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 231 (27841) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Новы рулявы футбольнай зборнай**

СТАР. 3



**Як гучыць жаночая душа?**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар НАЗАРАНКА, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Якасць нашай прадукцыі сёння высокая. Беларускія прадпрыемствы выпускаюць шырокую наменклатуру тавараў з выдатнымі спажывецкімі характарыстыкамі. Мне здаецца, што ў той сітуацыі, якая склалася, тут часам выкарыстоўваецца інструмент нездаровай канкурэнцыі, калі пачынаюць гаварыць, што прадукцыя шкодная. Дзяржстандарт досыць высока ацэньвае сістэму кантролю Беларусі за паказчыкамі бяспекі. І прадпрыемствы, якія адступілі ад патрабаванняў бяспекі, знаходзяцца на строгім кантролі адпаведных службаў, у тым ліку і службаў Дзяржстандарту. Таму для вырашэння спрэчных сітуацый трэба выкарыстоўваць пляцоўку Еўразійскай эканамічнай камісіі. Практычна па любым пытанні ёсць патрэбныя дэпартаменты і спецыялісты, якія ў стане кампетэнтна разабрацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10830,00 | ▲ |
| Еўра | 13320,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 205,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 719,72 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Музыка душы

Звычайна гаворачы «арганіст», мы маем на ўвазе менавіта мужчыну, бо складаны духавы інструмент патрабуе не толькі ўмення, але і фізічнай сілы. Ганна Малькевіч, хутчэй, выключэнне з правілаў. Яна 30 гадоў працуе загадчыцай філіяла Вілейскай дзіцячай школы мастацтваў у вёсцы Далгінава, а 20 з іх іграе на аргане ў вясковым парафіяльным касцёле. У гэтыя дні Ганна Мечыславаўна рыхтуецца да калядных свят, каб у дні Божага Нараджэння яе арган гучаў асабліва ўрачыста.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

## ГАЛАЛЁД І ТУМАН

### На наступным тыдні пацяплее, аднак мокры снег нам не даспадобы...

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны зноў трапіць пад уплыў зоны павышанага ціску, якая была сфарміравана ў вільготнай паветранай масе, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў асобных раёнах пройдзе невялікі снег, месцамі чакаецца слабы туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад 0 да мінус 5 градусаў. Ужо ў суботу і нядзелю на тэрыторыю пачнуць распаўсюджвацца вільготныя паветраныя масы з боку паўднёвага ўсходу Еўропы. Таму ў суботу месцамі, а ў нядзелю ўжо паўсюдна пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы ў выхадныя будзе ад 2 да 9 марозу, а ў ноч на суботу пры праясненнях да мінус 12 градусаў. Удзень плануецца ад мінус 5 да плюс 1 градуса.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Месцамі будзе ісці невялікі снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман і слабы



галалёд. На дарогах — галалёдзіца. З панядзелка і да серады тэмпература паветра ўначы будзе ў межах 1-8 марозу, удзень — ад мінус 4 да плюс 1 градуса. Менавіта такое няўстойлівае надвор'е і тэмпературны фон адпавядае кліматычнай норме першай дэкады снежня.

**Сяргей КУРКАЧ**

Прамая лінія

## ХВАРОБА — НЕ ПРЫСУД

Самыя розныя пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін, а таксама з арганізацыяй анкалагічнай дапамогі, можна будзе задаць падчас «прамой лініі» **галоўнаму ўрачу Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіміру Сцяпанавічу КАРАНІКУ**.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **12 снежня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумары **287 18 71**. Папярэднія пытанні можна пакінуць, пазваніўшы на нумар **287 18 29**.

# НАШ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ

## Сур'ёзным бар'ерам на шляху распаўсюджвання наркотыкаў павінна стаць татальнае непрыманне іх грамадствам

**Аб гэтым на нарадзе па пытаннях процідзеяння незаконнаму абароту наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў краіне павінна быць выбудавана дакладная іерархія, якая будзе вызначаць не толькі галаўное ведамства, што будзе адказваць за гэты кірунак, але і паўнамоцтвы ўсіх адказных дзяржаўных органаў і іншых арганізацый. «Лішняга нічога пры гэтым быць не павінна. Сур'ёзным бар'ерам на шляху распаўсюджвання наркотыкаў павінна стаць татальнае непрыманне іх грамадствам. Фарміраванне адпаведнага светапогляду, заснаванага на традыцыйных для нашай краіны хрысціянскіх каштоўнасцях і іншых, — задача не толькі дзяржавы і сродкаў масавай інфармацыі, але і грамадскіх арганізацый, царквы, установ адукацыі і, самае галоўнае, сем'яў і грамадзян», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Тады ў спалучэнні з карнымі мерамі можна будзе дасягнуць неабходнага эфекту.

На нарадзе абмяркоўвалася ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы, якая дала б магчымасць больш аператыўна і дзейсна змагацца з наркапагрозай. У сувязі з гэтым кіраўніку дзяржавы быў прадстаўлены праект адпаведнага закона. Ад удзельнікаў нарады Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў адказаў на некалькі пытанняў. Прэзідэнта цікавіла, наколькі меры па барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў, у тым ліку тыя, якія прапануюцца новым заканадаўчым актам, маюць комплексны характар і забяспечваюць процідзеянне ўсяму магчымаму спектру, ці даюць магчымасць прапанаваныя меры аператыўна рэагаваць і спыняць любыя хітрыкі з боку наркагандляроў і вытворцаў наркотыкаў.

Прэзідэнт нагадаў, што сёлета ў студзені быў выдадзены дэкрэт, які забяспечвае комплекснае процідзеянне абароту опіумнага маку; а гэта дало магчымасць скарацiць яго ўжыванне. «Удалося яго скарацiць — тут жа ўзнікла праблема са спайсамі. Што далей? Ці вырашае гэтую праблему прадстаўлены законапраект? Наколькі сёння мы можам дакладна спрагназаваць і папярэдзіць магчымыя новыя наркапагрозы ў бліжэйшай перспектыве? Ці дастаткова ў нас сіл і сродкаў? Напрыклад, ці ўмеем мы змагацца са схемамі распаўсюджвання наркотыкаў, якія прадугледжваюць шырокае выкарыстанне інтэрнэту?» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, кіраўніка дзяржавы цікавіла, якія змяненні ў заканадаўстве прадугледжваюцца ў дачыненні да тых, хто спажывае наркотыкі, як вярнуць такіх людзей да нармальнага жыцця.

Аляксандра Лукашэнку асабліва непакоіць той факт, што кантынгент спажыўцоў наркотыкаў у Беларусі маладзее, у яго ўваходзяць школьнікі, навучэнцы прафтэхвучылішчаў, студэнты і іншыя катэгорыі моладзі. Павялічылася колькасць спажыўцоў курыльных сумесяў. Зарэгістравана больш за тысячу выпадкаў перадазіроўкі спайсамі. З іх 25 чалавек загінулі за два гады. «Гэта гора сям'і, дзяржавы і пагроза генафонду нацыі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што на нядаўняй сустрэчы са студэнтамі педагагічнага ўніверсітэта закраналася гэтая праблема. «Тады я паабяцаў, што мы аб'яднаем усе намаганні для вырашэння такой стратэгічнай задачы, як фарміраванне працавітай, адукаванай, здаровай нацыі. Тады было сказана, якую небяспеку ўяўляюць алкагалізм і наркаманія. Гэта не проста бяда асобных заняпалых людзей, а сур'ёзны выклік сучаснасці і будучыні нашага грамадства і дзяржавы. І гэтая пагроза датычыцца абсалютна ўсіх, і ў тым ліку прысутных за гэтым сталом, таму што ў кожнага ёсць дзеці і ўнукі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заклікаў падыходзіць да пытанняў барацьбы з незаконным абаротам наркатычных сродкаў менавіта з комплексных, агульнадзяржаўных, а не вузкаведамасных пазіцый.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным зрабіць больш строгім цяперашняе заканадаўства. «Для тых, хто асабліва вызначыўся ў гэтай сферы, — гадоў 20-25 яны павінны атрымаць. Тыя, хто менш вызначыўся, зразумела, менш. Скажыце, што гэта за градацыя, якія павінны быць тэрміны, мы ўсё запішам у закон. Дэпутаты нас падтрымаюць», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для злачынцаў у наркасферы неабходна ствараць максімальна строгія ўмовы ў месцах адбывання тэрмінаў. Што датычыцца тых, хто прызвычаіўся да спажывання наркотыкаў, то іх трэба лячыць. «Так, іх шкада, з аднаго боку, але іх трэба лячыць. Але не ў бальніцы, там, дзе нармальныя людзі лечацца, а ў такіх жа прафілакторыях, каб у яго не было часу падумаць аб нечым, акрамя сну і работы. А то ў нас некаторыя ў турму ходзяць па 10-15 разоў, як у дамы адпачынку», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўніку дзяржавы нядаўна было даложана аб двух фактах спынення дзейнасці цэлай наркаструктуры, у якой былі не толькі вытворцы, але і распаўсюджвальнікі наркотыкаў. «Нашы людзі ў міліцыі ведаюць іх у твар. Яны павінны сказаць, што да гэтай катэгорыі грамадзян мы павінны прымяніць, якія меры, каб іх паставіць на месца. Але і спажыўцы. Што трэба зрабіць для таго, каб гэты спажывец баяўся глядзець у бок наркотыкаў? На мой погляд, гэта галоўнае ў такім ланцугу. Вось вы і скажыце. Мы гэта ў закон запішам і зробім усё неабходнае, каб такі закон дзейнічаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

■ Знешняя палітыка

# ФАКТАЎ І ПРАВАВЫХ АРГУМЕНТАЎ ДАСТАТКОВА

## Пытанні беларуска-расійскага гандлю разгледзяць на міждзяржаўным узроўні

Міністэрства замежных спраў, беларускае пасольства ў Маскве аказваюць усю неабходную дапамогу нашым галіновым міністэрствам і ведамствам для больш хуткага вырашэння праблемных пытанняў у беларуска-расійскім гандлі і ў сферы транзіту. Пра гэта на чарговым брыфінгу заявіў **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС нашай краіны**.

— Рыхтуем разгляд гэтых пытанняў групай высокага ўзроўню Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, якая збярэцца 9 снежня, — паведаміў прэс-сакратар МЗС, — а таксама на пасяджэнні Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі 10 снежня. Пры неабходнасці гатовы вынесці іх таксама на разгляд Эканамічнага савета Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пасяджэнне якога адбудзецца 12 снежня.

Па словах Дзмітрыя Мірончыка, задача МЗС — максімальна аператыўна вярнуць сітуацыю ў спакойнае і, галоўнае, прававое рэчышча і ўрэгуляваць яе за сталом перамоў.

— Мы ўпэўнены, што ў беларускага боку дастаткова і фактаў, і прававых аргументаў, каб зрабіць гэта, — падкрэсліў дыпламат.

### У В'етнаме падвялі вынікі супрацоўніцтва з нашай краінай

У сераду і чацвер у в'етнамскім Хашыміне прайшло 11-е пасяджэнне Беларуска-В'етнамскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

Па словах Дзмітрыя Мірончыка, мерапрыемства арганізавана ў перыяд правядзення Нацыянальнай экспазіцыі нашай краіны ў рамках 12-й Міжнароднай выставы знешняга гандлю «Vietnam Expo in HoChiMinh City».

Прадстаўнік МЗС паведаміў, што на пасяджэнні бакі падвялі вынікі супрацоўніцтва дзвюх краін у розных сферах з моманту правядзення папярэдняга пасяджэння міжурадавай камісіі. Таксама былі абмеркаваны ход выканання Праграмы супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам у эканамічнай сферы на 2013 — 2015 гады.

### Міністры замежных спраў АБСЕ сустрэліся ў Базелі

Зараз у швейцарскім Базелі праходзіць 21-я сустрэча Савета міністраў замежных спраў АБСЕ. Дэлегацыю нашай краіны ўзначальвае міністр замежных спраў Уладзімір Макей. Па інфармацыі МЗС, акрамя ўдзелу ў мерапрыемствах Савета міністраў замежных спраў запланаваны шэраг рабочых сустрэч кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі па двухбаковай лініі. Таксама Уладзімір Макей плануе сустрэцца з кіраўніцтвам інстытутаў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

Надзея ЮШКЕВІЧ ■

■ Блізкая ўлада

# МНОГІЯ ПРАБЛЕМЫ — АД НЯВЕДАННЯ ПРАВОЎ

**На чарговым прыёме грамадзян па асабістых пытаннях старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік разам са спецыялістамі шукалі выйсце з заблытаных сітуацый.**



З надзеяй вырашыць свае жыллёвыя пытанні з Горак у Магілёў прыехалі маці двух шматдзетных сем'яў. Наталля Барысава разам з мужам і траімі дзецьмі прапісаны ў прыватным доме агульнай плошчай амаль 52 квадратныя метры. Летась іх уключылі ў жыллёва-будаўнічы кааператыў, але справіць наваселле не атрымалася. Жанчына абуралася тым, што доўгі час ім не называлі суму, якую трэба было ўнесці, не разгледзелі пытанне аб выдзяленні субсідыі і наогул пры выдачы даведкі аб займаным жылым памяшканні завысілі плошчу дома. Яна звярталася да старшыні райвыканкама, у сельскі Савет, але адказы яе не задаволілі. Пры гэтым, паскардзілася яна, чыноўнікі не заўсёды былі ветлівыя з ёю, а часам нават зневажалі.

Як высветлілася, у сям'і не знайшлося тых 118 мільёнаў уласных сродкаў, якія трэба было ўнесці падчас будаўніцтва. А таму нават дагавор з банкам на атрыманне льготнага крэдыту не быў заключаны. Сям'я спадзявалася пабудаваць кватэру ў элітным доме, дзе кошт аднаго метра складаў больш за 10,1 мільёна рублёў. Гэта пры тым, што дзейны нарматыў, ад якога залежыць памер ільготнага крэдыту, абмежаваны сумай 6,1 мільёна рублёў за квадратны метр. «Ці хапіла б шматдзетнай сям'і сродкаў пацягнуць такое далёка не таннае будаўніцтва?» — выказаў сумненні губернатар.

І ўдакладніў у спецыялістаў, якія яшчэ новабудоўлі з'явяцца ў бліжэйшы час у Горках і колькі там будзе каштаваць квадратны метр. Заяўніцы было прапанавана разгледзець магчымасць уключэння яе сям'і ў адзін з двух 40-кватэрных дамоў, якія плануецца здаць у наступным годзе. Там фіксаваны кошт квадратнага метра жылля складае прыблізна 7,2 — 7,3 мільёна рублёў. Пётр Руднік таксама даў даручэнне правесці разбор наконт непаважлівага стаўлення да жанчыны з боку службовых асоб.

А вось Ларыса Шастакевіч, якая таксама разам з мужам выхоўвае траіх дзяцей, прыйшла на прыём ужо другі раз. Сям'і патрэбен ільготны крэдыт на куплю кватэры на другасным рынку жылля. Паколькі новае жыллё каштуе ў 2 разы даражэй, такі варыянт выглядае больш прываблівым. Але сёлета ліміт ільготных сродкаў ужо выдаткаваны, і аблвыканкам звярнуўся ў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва па карэкціроўцы пераліку жылля, фінансаванне якога адбываецца з улікам дзяржпадтрымкі. Але пакуль што адпаведная пастанова міністэрства не прынята. Жанчыну абнадзеілі, што шанцы на атрыманне крэдыту ў яе дастаткова высокія, і паабяцалі трымаць пытанне на кантролі.

Жыхарка магілёўскага аграгарадка Буйнічы прыйшла на прыём да губернатара разам з нявесткай і ўнукам. Па законе зарэгістраваць нявестку ў інтэрнаце, дзе яны жывуць разам, нельга. У выніку ўзнікаюць праблемы пры зваротах у медыцынскія і іншыя ўстановы. Напрыклад, за паслугі ў паліклініцы маладая жанчына павінна плаціць грошы, паколькі ў яе няма «прывязкі да мясцовасці». Зварот да губернатара дапамог разабрацца з гэтым і іншымі пытаннямі.

Пётр Руднік звярнуў увагу спецыялістаў на тое, што часцей за ўсё непаразуменні ўзнікаюць ад няведання людзьмі сваіх правоў. Тыя ж шматдзетныя не заўсёды ведаюць пра свае льготы. І не лішнім будзе прымаць грамадзян пры ўключаных дыктафонах. Маўляў, тады не будзе абвінавачванняў у тым, што службовыя асобы вядуць сябе непрыстойна. Што датычыцца зваротаў тых грамадзян, якія пабывалі на прыёме ў губернатара, усе яны ўзяты на асаблівы кантроль да поўнага вырашэння праблем.

Нэлі ЗІГУЛЯ ■

# ПАСАЛІЦЬ НА ДАРОЖКУ

## 12 мільярдаў рублёў пайшло на закупку солі для дарог адной Мінскай вобласці

У дарожнікаў зіма доўжыцца паўгода.

— З 1 лістапада па 1 мая мы дзяжурым круглыя суткі, — гаворыць **кансультант галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Анатоль АДАМЦЭВІЧ**. — Падрыхтавалі ўжо тысячу адзінак снегаачышчальнай тэхнікі і больш за 500 машын для раскідвання солі і пяску. Дзе знаходзіцца тэхніка, адсочваецца па GPS-маніторынгу. На выпадак экстрэмальных умоў мы заключылі дагаворы з іншымі арганізацыямі: яны змогуць выдзеліць нам каля 300 спецыяльных машын.

Ёсць пяць узроўняў патрабаванняў да ўтрымання аўтадарог. Да першага адносяцца дарогі, якія злучаюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі. На працягу трох гадзін гэтае пакрыццё павінна быць цалкам апрацавана процігалалёдымі матэрыяламі, а пасля снегападу яго трэба ачысціць ад ападкаў за чатыры гадзіны.

— У сталіцы створана пятнаццаць пляцовак для часовага складавання снегу, — кажа **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання Анатоль ЖАМОЗДЗІК**.



Фота БЕЛТА.

Аўтамабілістаў узімку просяць ездзіць павольней.

— Нашы людзі і ў снег хочуць гнаць сто кіламетраў у гадзіну. Аднак, каб у снегапад, нават сярэдняй інтэнсіўнасці, дарога заставалася ідэальна чыстай, трэба кожныя дваццаць хвілін выпускаць снегаачышчальнікі. Самі разумееце, што гэта немагчыма, — тлумачыць **начальнік кіравання вытворчасці работ і ўтрымання дарожнай сеткі РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр» Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ**.

Уздоўж дарог усталявалі некалькі дзясяткаў кіламетраў шчытоў і сетак ад снегу. Самі дарогі, як і ў папярэднія гады, будуць пасыпаць соллю. На зіму нарыхтавана каля сямідзесяці тысяч тон тэхнічнай солі і ў шэсць разоў больш пясчана-саляной сумесі. Матэрыял, як высветлілася, нятанны. Дарожнікі працуюць з адходамі калійных камбінатаў, пабочным прадуктам. Аднак па кошце ён наблізіўся да друзу. Напрыклад, сёлета «Мінскаўтадар-Цэнтр» на закупку солі выдаткаваў 12 мільярдаў рублёў. Гэтых грошай хапіла б, каб пакласці 15 кіламетраў дарогі ў пяць сантыметраў таўшчынёй.

Дарэчы, на любімае пытанне аўтамабілістаў «Чаму ў Беларусі дрэнныя дарогі?» у міністэрства ёсць адказ:

— Дарога без ямачнага рамонту можа служыць 6 — 7 гадоў. Тое пакрыццё, што за 15 гадоў ні разу не рамантавалі, зараз латаць ужо позна: ямы і расколіны ўсё роўна з'яўляюцца. Аднак латаем, бо на новы слой патрэбны грошы. Зімой часам таксама трэба рабіць ямачны рамонт (хоць ён і нядоўга працрымаецца), каб было спакойна ездзіць, — каментуе Анатоль Францавіч Адамцэвіч.

— Шостая частка нашага бюджэту — 48 мільярдаў рублёў — ідзе на добраўпарадкаванне тэрыторыі: чысцім прыпынкі, раўняем знакі, — кажа Дзмітрый Уладзіміравіч. — Частку гэтай сумы можна было б зберагчы, каб нашы людзі паводзілі сябе крыху культурней.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Паритетбанк
www.paritetbank.by
**Открытое акционерное общество «Паритетбанк»,**
расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а,
**сообщает, что ранее объявленное на 15 декабря 2014 года внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме методом опроса не состоится.**
Справки по тел. (017) 288 63 31.
УНП 100233809.

**Аляксандр ХАЦКЕВІЧ:**

■ Тэма дня



Фота pressball.by

# «Цалкам у футболе ніхто ніколі не разбярэцца...»

## Новы трэнер зборнай Беларусі па футболе — чатырохразовы чэмпіён нашай краіны і сяміразовы трыумфатар украінскага першынства Аляксандр Хацкевіч

**Што такое футбол сёння? Разважанні на гэтую тэму зоймуць процьму часу, таму што кожны з нас бачыць гэтую гульню па-свойму. Як ні дзіўна, і простыя балельшчыкі, і журналісты, і нават трэнеры ніякіх патрабаванняў да гульцоў не выстаўляць. Іх ставіць сам футбол. Колькі трэба прабегчы за матч, зрабіць падкатаў, дакладных перадач, колькі хуткаснай работы правесці... Паглядзеўшы на вядучыя каманды свету, можна зрабіць выснову, што пастаяць за гонар сваіх краін на зялёным газоне прыязджаюць гульцы, якія гатовы на 100%, незалежна ад «зорнасці» і статусу.**

Ці так ідуць справы ў нашай зборнай? Нягледзячы на «салодкую пілюлю» ў выглядзе перамогі над высокакваліфікаванай у сучасным футбольным свеце зборнай Мексікі, нацыянальная каманда Беларусі працягвае свабоднае падзенне. Як ні круці, а лакмусавай паперкай стану яе спраў з'яўляюцца вынікі выступленняў у афіцыйных турнірах. З гэтым жа ў беларусаў ужо не першы год праблемы.

Так што вынесенае пытанне з'яўляецца рытарычным. Адказ на яго спрабавалі знайсці ўчора на выканкаме Беларускай федэрацыі футбола. Напярэдадні **старшыня АБФФ Сяргей РУМАС** коратка паведаміў, што на разгляд выканкама федэрацыі будзе вынесена кандыдатура Аляксандра Хацкевіча на пасаду галоўнага трэнера зборнай. Нагадаем, што гэтая пасада заставалася вакантнай пасля таго, як у кастрычніку яе пакінуў Георгій Кандрацьеў. У лістападзе абавязкі галоўнага трэнера выконваў Андрэй Зыгмантовіч.

Тут бы задаць пытанне нашым футбольным кіраўнікам: навошта было бударажыць грамадскасць інфармацыяй, што не менш як тры дзясяткі футбольных спецыялістаў — ад нашых Ганчарэнкі і Кучука да Дыега Марадоны, Блахіна і Хрыста Стоічкава — стаяць у чарзе, каб мець гонар асабіста ўзначаліць каманду Беларусі? Так і хацелася спытаць: яно ім трэба? У сэнсе — трэніраваць зборную, якая сёння мае 101-ю пазіцыю ў рэйтынгу ФІФА і туманныя перспектывы на будучыню. Зразумела было з самага пачатку: гэта не трэнеры з іменем шукалі працу ў Беларусі, а іх агенты дасылалі рэзюмэ сваіх кліентаў.

Так што пры ўсім «багацці» выбару — выбару не было. За Аляксандра Мікалаевіча прагаласавала абсалютная большасць членаў выканкама. **Намеснік старшыні АБФФ Сяргей САФАР'ЯН** патлумачыў выбар новага галоўнага трэнера зборнай краіны:

— Ацэньвалася сукупнасць кар'ер — гульца і трэнера. Акрамя таго, знаёмства з беларускім футболам, а таксама фінансавыя запыты. Па гэтых пазіцыях Хацкевіч набраў больш за ўсё ачкоў. Кантракт падпісаны да 1 лістапада 2017 года.

**Адразу пасля пасяджэння наваспечаны коўч даў прэс-канферэнцыю ў Доме футбола.**

***— Аляксандр Мікалаевіч, ёсць меркаванне, што работа з беларускай зборнай, якая сёння, відаць, самая слабая за ўсе 22 гады свайго існавання, практычна не мае ніякіх турнірных перспектыў, можа проста сапсаваць дзелавое рэнамэ любога трэнера. Вы ж згадзіліся...***

— Лічу, у кожнага чалавека ёсць што губляць. Вось сёлета я, на жаль, страціў свайго блізкага сябра — Валіка Бялькевіча... Але — мы маладыя, а трэнерская праца — гэта творчасць. Заўсёды існуе рызыка. Рэпутацыя заваёўваецца не адным днём і не адным годам. Яе неабходна напрацаваць, гледзячы ў заўтра, а не думаць аб тым, што работай можна сапсаваць меркаванне аб сабе. Інакш навошта тады наогул жыць і нешта спрабаваць рабіць?

***— Тады што вы скажаце аб гульні беларускай зборнай, яе стылі, патэнцыяле?***

— Я, вядома, сачыў за выступленнем зборнай. Але як балельшчык. Нават калі глядзеў гульню каманд Беларусі і Украіны, сімпаты былі на баку першай. Нягледзячы на тое, што я шмат часу жыву ва Украіне. Адно магу сказаць дакладна: незалежна ад саперніка ў пяць абаронцаў наша зборная гуляць не будзе. Цалкам у футболе ніхто ніколі не разбярэцца. Буду пацікху ўнікаць. Гэта не значыць, што я зусім не сачыў за беларускім футболам. Маю дастаткова інфармацыі.

***— Ці раіліся з кім-небудзь, перш чым прыняць прапанову?***

— Падтрымліваю адносіны з Віктарам Міхайлавічам Ганчарэнкам. Ён цалкам мяне падтрымаў, калі яшчэ працаваў у «Кубані». Пасля звальнення шчыра прызнаўся, што на яго таксама выходзіла федэрацыя. Хто яшчэ? Натуральна, гэта вядомы ў нядаўнім мінулым футбаліст Сяргей Раброў.

***— Ці ёсць у вас згода пра тэрміны пагаднення?***

— Магу сказаць, што кантракт будзе падпісаны да 2017 года — гэты і наступны цыкл. Але калі ўбачу, што не спраўляюся са службай, прэтэнзій па кантрактных абавязацельствах да працадаўцы не будзе. Ёсць дамоўленасць, што, калі няма прагрэсу, трымацца за месца не буду.

***— Якія задачы пастаўлены перад вамі ў гэтым адборачным цыкле?***

— Зразумела, чым вышэй падніме цца зборная — тым лепш. Зрэшты, кожная гульня — гэта перспектыва. Трэба прытрымлівацца гэтага пункту гледжання.

***— Як паставіцеся да вяртання старых гульцоў у склад зборнай?***

— Спачатку трэба паглыбіцца ў беларускі футбол. Каго будзем выклікаць — яшчэ разбяромся. Пераходзіць на асобы не будзем. Па Аляксандру Глебу магу сказаць адно: такімі футбалістамі не раскідваюцца.

***— Ці ёсць сярод вашых настаўнікаў тыя, стыль якіх вы ўзялі б за аснову сваёй трэнерскай канцэпцыі?***

— Безумоўна, дысцыпліну ад Лабаноўскага, і не толькі на футбольным полі. Абавязкова павінна быць шчырая гульня Малафеева. Але футбол пайшоў нашмат далей. Перш за ўсё ў тактычным плане.

***— Як вы будзеце выбудоўваць адносіны з футбалістамі?***

— Для сябе я растлумачыў, але ўсё пакінем паміж намі. Вы пра гэта даведаецеся, калі я сустрэнуся з камандай. Хлопцы раскажуць.

***— Не будзем утойваць: цікавасць балельшчыкаў да зборнай мінімальная. Як збіраецеся яе вярнуць?***

— У першую чаргу — гульня, вынік. Першая трэніроўка на зборах будзе адкрытай. Прычым гэта не першыя 15 хвілін для СМІ, а цалкам. Далей ужо рэгламент іншы. Увогуле, мы павінны рухацца наперад усе разам.

***— Некаторыя лічаць, што ў вас недастаткова вопыту?***

— Маладым у нас дарога, старым у нас пашана. Вопыт? Сем гадоў працую. Толькі адзін год — як памочнік. Шэсць гадоў — галоўным. Ды і я з шасці гадоў у футболе, у мяне былі добрыя настаўнікі. Я бачыў, як працавалі Блахін, Сёмін. Гэта не лічачы Лабаноўскага і Малафеева.

**Дададзім таксама, што ў трэнерскім штабе зборнай Беларусі працягне працаваць былы гулец нацыянальнай каманды Аляксандр Кульчы. Акрамя таго, будзе прыцягнуты замежны спецыяліст, імя якога пакуль не называецца.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■

■ Будзь у курсе

# КАЛІ САБРАЛІСЯ НА КАЛЯДЫ Ў ВЁСКУ...

**Стала вядома, як, у сувязі з пераносам рабочых дзён, згодна з пастановай Савета Міністраў № 1060 ад 10.11. 2014, будзе арганізавана работа прыгарадных маршрутаў напярэдадні і падчас зімовых свят.**

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» інфармуе, што 19 снежня і 9 студзеня яны будуць перавозіць пасажыраў па графіку чацвярга; 20, 24, 31 снежня і 6, 10 студзеня — па графіку пятніцы. Калі некаму спатрэбіцца дабрацца ў прыгарад 25 студзеня, давядзецца арыентавацца на расклад суботы. А вось 21, 26—28 снежня і 1-4, а таксама 11 студзеня работа прыгарадных маршрутаў будзе арганізавана па графіку нядзелі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Май на ўвазе

# У СТАЛІЦЫ — НОВЫЯ ПАРКОЎКІ

**У цэнтры Мінска з'явяцца тры платныя паркоўкі, паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.**

Дзве з іх размесцяцца па абодвух баках плошчы Якуба Коласа, трэцяя — на вуліцы Веры Харужай каля дамоў №22 і №24. Гадзіна стаянкі на гэтых паркоўках абыдзецца ўладальнікам аўтатранспарту ў 10 тысяч рублёў.

З пачатку месяца стаў платным уезд на тэрыторыю Верхняга горада ў межах вуліц Багдановіча — Інтэрнацыянальная — Гандлёвая — плошча Свабоды. Там устаноўлена абсталяванне аўтаматызаванай аплаты за паркоўку. Прычым гадзіна стаянкі аўтамабіля каштуе 20 тысяч рублёў.

Ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама нагадалі, што аплаціць паркоўку ў цэнтры сталіцы можна рознымі спосабамі: праз СМС-паведамленні і USSD-запыты, пры дапамозе спецыяльна створанага дадатку, пластыкавай карткі праз банкамат, паркоўачнай карткі, якую можна набыць у кіёсках «Белсаюздрука», а таксама праз паркоўачныя тэрміналы. Разабрацца з новай сістэмай аўтаматаў дапамогуць інфармацыйныя шчыты на стаянцы. Акрамя таго, з пытаннямі можна звярнуцца да супрацоўнікаў спецыяльнай інспекцыі, у абавязкі якіх уваходзіць кантроль за аплатай.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Ідзі і здымай

# Стартаваў 4-ы сезон фестывалю мабільнага кіно Smartfilm

Арганізатары заклікаюць удзельнікаў «стварыць сваю гісторыю з фрагментаў»

**Сёлета фэст, які ўжо некалькі гадоў запар ладзіць кампанія Velcom, крыху змяніў фармат і жанравыя рамкі. Па першае, на гэты раз праект знайшоў падтрымку як з боку дзяржавы — яго з задавальненнем патрануе Міністэрства культуры Беларусі — так і з боку прадстаўнікоў бізнесу: партнёрам Smartfilm-2014 выступіла прадстаўніцтва кампаніі Microsoft, якое забяспечыць у тым ліку сур'ёзныя прызы, а інфармацыйную падтрымку аказвае партал tut.by. Па-другое, аматарам мабільных здымак і майстрам «кароткага метра» прапануецца спаборнічаць у здымках... трэйлераў, якія пакрысе робяцца асобным відам кінамастацтва.**

Працаваць можна ў розных жанрах — баявік, камедыя, фільм жахаў, драма, трылер, дэтэктыў, меладрама, але галоўнае правіла застаецца нязменным: відэа мусіць быць знята на камеру мабільнага тэлефона, смартфона або планшэта.

У ліку іншых абавязковых патрабаванняў — перадусім тэхнічныя ўмовы: творцам трэба ўкласціся ў тэрмін з 2 снежня па 23 студзеня ўключна, працягласць фільма да 3 хвілін, а аб'ём не большы за 50 Мб, і г.д. Больш падрабязна з правіламі ўдзелу можна пазнаёміцца на афіцыйным сайце фестывалю smartfilm.by, дзе пазней і будуць размешчаны работы прэтэндэнтаў. Ацэньваць іх журы — а ў яго склад увайшлі вядомы кінакрытык Ігар Сукманаў, культуролаг Максім Жбанкоў, рэжысёр і прадзюсар Канстанцін Фам і арганізатар фестываляў, арт-дырэктар Максім Старцаў, — будзе як па якасці відэаматэрыялу, так і па крэатыўнасці аўтара, уменню працаваць з гукам і спецэфектамі, адпаведнасці работы выбранаму жанру... «Любое кіно, незалежна ад жанру, мусіць быць перадусім таленавітым, змястоўным і крэатыўным, каб яго заўважылі і адабралі для ўдзелу ў любым конкурсе, — разважае наконт крытэрыяў ацэнкі «вельмі кароткага метра» **Ігар Сукманаў**. — Па шчырасці, мне і самому цікава, наколькі смартфільмы будуць адпавядаць катэгорыі кіно і ці змогуць яны стаць чымсьці большым, чым проста баўленне часу, зачапіць, пакінуць пасля сябе нейкі след». Рэжысёр **Канстанцін Фам**, чый фільм «Туфлікі», прысвечаны памяці ахвяр халакосту, стаў лаўрэатам мноства прэмій і фестываляў і быў адзіным расійскім фільмам, вылучаным на «Оскар» у 2013 годзе, перакананы, што ў аснове ўсяго ляжыць ідэя: «Калі табе няма чаго сказаць, лепш наогул не пачынаць здымаць. А калі ёсць, то нават на мабільны тэлефон можна зняць фільм, які паглядзяць мільёны людзей».

Дарэчы, і матэрыяльны стымул для ўдзельнікаў конкурсу-фестывалю вельмі нават адчувальны — пераможцы ў дзесяці намінацыях атрымаюць флагманскія смартфоны ад Microsoft — Nokia Lumia 930, а ўладальнік гран-пры Smartfilm-2014 — Blackmagic Cinema Cameras, якая, запэўніваюць арганізатары, высока каціруецца сярод прафесіяналаў кіно. Акрамя таго, як расказала кіраўнік упраўлення маркетынгу кампаніі Velcom Юлія Дайнека, сёлета ўпершыню ў гісторыі фестывалю для ўсіх ахвотных падрыхтавана серыя адкрытых майстар-класаў пад назвай «Студыя Smartfilm». Хочаце даведацца з першых вуснаў, як робіцца кіно і ў чым сакрэты пасляховых фільмаў? Не прапусціце — расклад майстар-класаў будзе змешчаны на афіцыйным сайце фестывалю ў бліжэйшы час.

Каму дастануцца ўзнагароды сёлетняга фестывалю, суддзі вызначаць да 4 лютага 2015 года (цырымонія ўзнагароджання запланавана на 5 лютага), а пакуль яны чакаюць удзельнікаў — актыўных, творчых, сцілых да эксперыментаў, якія маюць што сказаць патэнцыйным гледачам. За мінулыя некалькі гадоў удзельнікі Smartfilm, дарэчы, знялі каля 500 мабільных фільмаў — гэта каля 2 сутак бесперапыннага прагляду маленькага, але разнастайнага, яркага і змястоўнага кіно.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

■ Жыллё

# ЧАС БУДАВАЦЦА ЗА ЎЛАСНЫЯ СРОДКІ

**Ужо традыцыйна напярэдадні новага года ўсіх жыллёвых чаргавікоў больш актыўна цікавяць пытанні, якія тычацца будаўніцтва жылля. Дзе плануюць узводзіць у сталіцы новыя мікраraёны і колькі арэндных кватэр паводле дзяржпраграмы атрымаюць беларусы ў наступным годзе? Аб гэтым і іншым ішла гаворка падчас анлайн-канферэнцыі на сайце Белтэлерадыёкампаніі з начальнікам упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандрам ГОРВАЛЕМ.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## СТАЛІЧНЫМ ЧАРГАВІКАМ ТРЭБА «ПРЫГЛЯДАЦЦА» ДА КАМЕРЦЫЙНАГА БУДАЎНІЦТВА

Вядома, што жыхароў сталіцы нашай дзяржавы цікавіла пытанне перспектыў будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Хто цяпер на гэтую падтрымку можа разлічваць? Толькі шматдзетныя і іншыя льготнікі, ці нехта яшчэ?

Аляксандр Вітальевіч адзначыў, што ў Мінску і сапраўды існуе праблема шматдзетных сем'яў, бо прыток іх у сталіцу павялічыўся. Таму для гэтай катэгорыі ў межах краіны будуецца шмат жылля. Сёння шматдзетным сем'ям на працягу года трэба прапанаваць варыянты паляпшэння жыллёвых умоў для таго, каб выконваць заканадаўчую норму, вызначаную ўказам Прэзідэнта. Таму ў першую чаргу Мінгарвыканкам разглядае магчымасць забеспячэння жыллём менавіта іх. Што тычыцца іншых катэгорый, якія маюць права на першачарговае атрыманне жылля, то гэта таксама вызначана ўказам Прэзідэнта №13, дзе ўсе катэгорыі прапісаны. Далей ідуць проста чаргавікі, якія не маюць права на дзяржаўную падтрымку. Такіх у Мінску каля 240 тысяч сем'яў.

З гэтымі чаргавікамі крыху складаней. Трэба мець на ўвазе, што ў сталіцы змяншаецца аб'ём жыллёвага будаўніцтва. Калі раней будавалася да 1 млн 400 тыс. квадратных метраў, то сёлета будзе ўзведзены мільён «квадратаў», заданне на наступны год — ужо 900 тысяч квадратных метраў. Тэндэнцыя да зніжэння працягнецца і надалей, каб не сцягваць усіх жыхароў краіны ў Мінск. Таму ў сталіцы толькі каля паловы жылля будуецца для чаргавікоў, астатняе — гэта ўжо камерцыйнае жыллё, якое будуецца па долевым прынцыпе. Таму дачакацца ў сталіцы сваёй чаргі даволі праблематычна. Людзям трэба прыкладаць намаганні і ўкладваць уласныя фінансавыя рэсурсы ў сістэму камерцыйнага жылля. У долевым будаўніцтве цяпер вызначаны нарматыў, які прадугледжвае не больш за 5% прыбытку на такім камерцыйным будаўніцтве для тых, хто стаіць у жыллёвай чарзе. Пакуль гэта адзіная падтрымка дзяржавы для «стандартных чаргавікоў» пры камерцыйным будаўніцтве.

## ПРАБЛЕМА ДАЎГАБУДАЎ БУДЗЕ ВЫРАШАНА

Паводле апошняй інфармацыі Аляксандра Горвеля, цяпер у краіне існуюць 32 дамы, якія аднесены да аб'ектаў, у якіх парушаны ўстаноўленыя тэрміны будаўніцтва. З кожнай такой пабудовай персанальна разбіраюцца і Мінбудархітэктуры, і мясцовыя выканаўчыя камітэты. Калі казаць пра засяленне ўжо гатовага дома, то пастаўлена задача праводзіць яго не пазней за месяц з моманту яго здачы. Для гэтага распрацавана нарматыўна-прававая база, якая дазваляе скарачаць тэрміны ўсіх працэдурных момантаў, што папярэднічаюць засяленню. Таксама плануецца ўвесці адказнасць забудоўшчыка за тое, каб гэты перыяд быў не больш за месяц. Тут вызначаны і ўмовы засялення такіх дамоў. Чалавеку абавязаны спачатку прад'явіць жылое памяшканне, за якое ён ужо цалкам разлічыўся. Таму ў першую чаргу неабходна ўрэгуляваць усе фінансавыя адносіны. Пасля чаго дом павінен адпавядаць усім праектным рашэнням і тэхнічным характарыстыкам у частцы выканання канструктыўных элементаў і ў частцы падключэння інжынерных сетак. Таксама павінны быць ліквідаваны недахопы, калі яны ёсць, па асобных кватэрах. Пасля ўсіх гэтых працэдур сям'я абавязана атрымаць тое жылое памяшканне, якое ёй належыць па дагаворных адносінах.

**У Смалявічах так атрымалася, што першы дом пабудавалі ў чыстым полі, дзе ніякіх сетак няма. Цудоўны настрой людзей, якія павінны былі жыць у гэтым доме, сапсаваўся. Гэта кінула цень на саму ідэю гарадоў-спадарожнікаў.**

## ДЛЯ ГАРАДОЎ-СПАДАРОЖНІКАЎ ГАЛОЎНАЕ — ІНФРАСТРУКТУРА

Падчас анлайн-канферэнцыі да Аляксандра Горваля звярнуліся жыхары Рудзенска, якіх хвалюе пытанне павярхоўвасці ў будучых новых кварталах гэтага горада-спадарожніка. Ці зменіцца іх жыццё ў лепшы бок? Безумоўна зменіцца, але не так хутка, як чакаюць жыхары Рудзенска, лічыць Аляксандр Горваль. Зараз вядуцца праектныя работы, а да Рудзенска «рэальная справа» дойдзе не сёння. Падобныя работы ажыццяўляюцца ў асноўным у Смалявічах, і то на пачатковай стадыі.

**У мностве раёнаў інфраструктура пачынае працаваць у напружаным стане і можа «забуксаваць» пры абслугоўванні такой колькасці насельніцтва.**

Галоўная праблема гарадоў-спадарожнікаў — адсутнасць інфраструктуры. Пакуль нават адзін шматкватэрны дом непасільны для гэтых гарадоў, калі не стварыць магутную інфраструктуру. Яе трэба арганізоўваць на апярэджанне, для вялікай групы насельніцтва. Акрамя таго, неабходна паклапаціцца пра адпаведныя транспартныя зносіны, бо людзі працуюць у Мінску. Увогуле трэба маштабна ствараць працоўныя месцы, і гэта справа не аднаго дня і не аднаго года. Але працэс пайшоў, лічыць эксперт. Наша краіна трохі адстала ад сусветнай тэндэнцыі, калі ва ўсіх буйных гарадах ёсць свае гарады-спадарожнікі. З цягам часу, магчыма, не толькі ў сталіцы, але і ў абласных цэнтрах з'явіцца спадарожнікі. Але першы этап — гэта моцная інфраструктура, бо голыя сцены не вырашаюць жыллёвую праблему для чалавека. У Смалявічах так атрымалася, што першы дом пабудавалі ў чыстым полі, дзе ніякіх сетак няма. Цудоўны настрой людзей, якія павінны былі жыць у гэтым доме, сапсаваўся. Гэта кінула цень на саму ідэю гарадоў-спадарожнікаў. Таму цяпер тут не спешка патрэбна, а сістэмны падыход, для таго каб канчатковы прадукт быў якасны, упэўнены начальнік упраўлення.

## АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ ПРЫВАТЫЗАВАЦЬ НЕЛЬГА

Цікава, а якую перспектыву чакае арэнднае жыллё, калі жыхары пражывуць у ім 10, 20 ці 30 гадоў? Ці дазволяць такое жыллё прыватызаваць? Зразумела, што падобнае пытанне не ў кампетэнцыі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, паколькі ўжо гатовым арэндным жыллём распараджаюцца мясцовыя выканкамы, а заканадаўчую базу вядзе Міністэрства ЖКГ.

Аднак суразмоўца адзначыў той факт, наколькі высокі попыт на гэты тып жылля. Новага арэнднага жылля будуецца пакуль няшмат, але гэтую структуру як канцэпцыю наладжваюць дзеля таго, каб стварыць умовы па некалькіх кірунках. Па-першае, збіць кошт арэнды на рынку ў цэлым, а па-другое, стварыць магчымасць перамяшчэння рабочай сілы: прыхільнасць да гэтага месца жыхарства запавольвае рух працоўных рэсурсаў.

Цяпер аб прыватызацыі. У бюджэт закладваюцца значныя сумы на будаўніцтва арэнднага жылля. Ці існуе сэнс потым яго пераафармляць? Гэта цягне за сабой павышэнне выдаткаў дзяржавы на будаўніцтва. Пытанне аб яго прыватызацыі пакуль увогуле не стаіць. Мінімальны дагавор арэнды — 5 гадоў, а далей ён можа прадаўжацца яшчэ неадназразова. Дагавор можа быць скасаваны толькі ў выпадку няўплаты арэнды і нядобрасумленнага стаўлення жыхара да жылога фонду. А калі ўсё нармальна, то чалавек будзе працягваць жыць у гэтым жыллі са сваёй сям'ёй, і дзеці змогуць працягваць арэндныя адносіны.

Ёсць яшчэ адно пытанне. Нават пры наяўнасці сістэмы дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе льготных крэдытаў і субсідый далёка не ўсе малазабяспечаныя слаі насельніцтва могуць абслугоўваць існуючыя льготныя крэдыты. Таму такая арэнда стане выйсцем для тых, хто не можа, з-за свайго невысокага даходу, выплачваць крэдыты. Плацяжы па арэндзе жылля меншыя, чым па крэдыце, а кошт дзяржаўнай арэнды ў 2-3 разы ніжэйшы за кошт камерцыйнай.

## РОСТ МІНСКА БУДУЦЬ СТРЫМЛІВАЦЬ

Сёння агучаны падыходы кіраўніка дзяржавы і ўрада на гэты конт. Сапраўды, не трэба нарошчваць такімі інтэнсіўнымі тэмпамі колькасць насельніцтва ў Мінску, бо гэта пагаршае ўмовы жыцця гараджан. Тут у мностве раёнаў інфраструктура пачынае працаваць у напружаным стане і можа «забуксаваць» пры абслугоўванні такой колькасці насельніцтва. Пытанне ўзнікае і па працоўных месцах у тым ліку таму, што ў буйным горадзе ў нас не ствараюцца новыя вытворчыя магутнасці. Калі казаць пра нейкія канторы, то не яны сёння з'яўляюцца галоўнай прадукцыйнай сілай. Інтэлектуальны патэнцыял трэба развіваць па лініі стварэння Парка высокіх тэхналогій, Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка, які неўзабаве пачнуць будаваць, — вось па гэтых кірунках дазваляецца прыток насельніцтва ў сталіцы. Усё астатняе трэба рэгуляваць. У Мінску і так жыве амаль чвэрць насельніцтва краіны, лічыць Горваль. Гэта вельмі шмат па міжнародных параметрах.

Напэўна, праз нейкі час мы ўсё роўна выйдзем на павольнае пашырэнне межаў Мінска, бо вялікія жылмасівы знаходзяцца за межамі горада, але яны ўжо фактычна зліліся. Магчымыя нейкія змены і ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле, але на сёння палітыка такая, каб стрымліваць сталіцу ў тых межах, якія яна мае, упэўнены начальнік упраўлення.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Азбука бяспекі

# ВЕЛАСІПЕД З ЗІМОЙ «НЕ СЯБРУЕ»

**За першыя дні снежня на дарогах краіны загінулі два веласіпедысты, яшчэ адзін атрымаў траўмы.**

Каля шасці вечара паблізу вёскі Вяргховічы Камянецкага раёна 37-гадовы мясцовы жыхар, кіруючы аўтамабілем «Аўдзі А6», на аўтадарозе мясцовага значэння наехаў на 50-гадовую жыхарку вёскі Кунаховічы. Жанчына загінула. А паблізу вёскі Кошчава Бешанковіцкага раёна ў 15.30 28-гадовая жыхарка вёскі Верхняе Крывіна, якая кіравала аўтамабілем «Сітраен Ксара Пікаса», здзейсніла наезд на 53-гадовую жыхарку гарпасёлка Бешанковічы. Жанчына ехала на веласіпедзе па краі праезнай часткі ў спадарожным напрамку. Як і ў першым выпадку, веласіпедыстка загінула...

УДАІ МУС нагадвае, што ва ўмовах снегападу і (ці) галалёдзіцы рух на веласіпедзе забаронены. А пры руху па дарозе ў цёмны час сутак ці пры недастатковай бачнасці на двухколавым транспарце павінны быць уключаны: спераду — фара, якая выпраменьвае белае святло, ззаду — фара з чырвоным святлом. Для павышэння бяспекі Дзяржаўтаінспекцыя раіць веласіпедыстам апранаць камізэльку павышанай бачнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Факт

## СНЕГАВЫЯ ГАРМАТЫ Ў КАРОБЧЫЦАХ

**Першых наведвальнікаў чакае ў суботу, 6 снежня, гарналыжны комплекс каля вёскі Каробчыцы Гродзенскага раёна.**

Паколькі снежнага покрыва пакуль не хапае, на дапамогу прыйшлі спецыяльныя гарматы, каб узровень снегу на спусках дасягнуў 50-100 сантыметраў. Спачатку плануюцца два спускі: адзін — для гарналыжнікаў-пачаткоўцаў, другі — з больш крутым схілам. Падрыхтаваны пад'ёмнікі, за парадкам будуць сачыць інспектары, прыняты на працу доктар-траўматолаг. Арэнда цюбінга (гумавага аналага санак) будзе каштаваць 100 тысяч рублёў за дзень, а карыстанне лыжамі і ўсёй неабходнай экіпіроўкай — каля 280 тысяч рублёў. Крыху больш прыйдзецца заплаціць за катанне на сноўбордзе.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## АГОНЬ ЗНІШЧЫЎ ХРАМ

**Царква Свяціцеля Мікалая Цудатворцы, пабудаваная 50 гадоў таму ў вёсцы Стараселле Добрушскага раёна, загарэлася днём, калі службы не было.**

Праз пяць хвілін прыбылі выратавальнікі з бліжэйшага паста, аднак дах палыхаў адкрытым полымем. Будынак, як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, драўляны, абкладзены цэглай. У момант узнікнення пажару ў храме людзей не было. Пажар быў патушаны праз гадзіну, але ж практычна ўсё начынне, а таксама дах, столевае перакрыцце, абразы, іканастас, алтар знішчаны. Па папярэдніх меркаваннях, прычынай узгарання магло стаць парушэнне правілаў эксплуатацыі ацяплення.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ТОЛЬКІ ГАШЫШУ БЫЛО 18 КІЛАГРАМАЎ...

**Мінскія міліцыянеры перакрылі адзін з найбуйнейшых сёлета каналаў пастаўкі ў краіну наркотыкаў.**

Падчас правядзення спецаперацый у некалькіх раёнах сталіцы былі затрыманы чацвёра грамадзян Беларусі і адзін грамадзянін Аўстраліі. Пры правядзенні вобыску ў прыватным доме па месцы жыхарства аднаго з затрыманых мінчан былі знойдзены больш за 260 грамаў какаіну і каля 500 грамаў марыхуаны. Як паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама, у далейшым па месцы жыхарства аднаго з падазраваных супрацоўнікі міліцыі дадаткова выявілі яшчэ каля 10 грамаў какаіну і 18 кілаграмаў гашышу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# «Дай жа, Божа, мужанька да маёй натуры!»

**Фальклорныя вандроўкі — гэта свята. На ім збіраюцца людзі, якіх аб'ядноўвае любоў да песні. Гаспадары дзеляцца з гасцямі духоўным скарбам, у якім вопыт мінулых пакаленняў (а бывае і гісторыі цэлых дынастый) і час перастае існаваць у вымярэннях «мінулае» і «сучаснае». Бо, пачуўшы спевы і паданні, ты дакранаешся да вечнага, і пасля гэтага немагчыма застацца абыякавым. Так, пасля сустрэчы і знаёмства здымачнай групы праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» і карэспандэнта «Звязды» з народным фальклорным ансамблем «Аршаначка» хочацца гаварыць пра лёс жанчыны, тэмай, якой пранізана кожная песня…**




ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ПЕСНІ ЗАЎСЁДЫ НЕСЛІ НАРОДНУЮ МУДРАСЦЬ...

Гэтым разам мы завіталі ў вёску Антонаўка Аршанскага раёна, якая знаходзіцца на тэрыторыі Бабініцкага сельсавета. Здымачная група рыхтуецца да працы — аператары настройваюць тэхніку і абмяркоўваюць, як лепш размясціць калектыў на сцэне, мы ж азіраемся навокал… Невялікая зала, якія можна сустрэць у сельскай мясцовасці; сцэну ўпрыгожвае фон з вышытых ручнікоў і сноп калосся. У такіх выпадках, мабыць, кажуць: чым багаты — тым і рады. Але такое назіранне пасля пачутых песень наводзіць на думку, што сапраўдны талент можа радаваць сваім гучаннем і выжываць у любых умовах.

Народны фальклорны ансамбль «Аршаначка» ўзнік амаль дваццаць пяць гадоў таму. Яго заснавалі муж і жонка Полазавы: ён быў гарманістам, а яна любіла спяваць.

— Многія песні з тых, што спявалі яны, мы выконваем дагэтуль. «Аршаначка» ўтварылася ў 1990 годзе. Тады спявалі шэсць чалавек — усе былыя работнікі Аршанскай птушкафабрыкі, — расказвае **кіраўнік калектыву Наталля КІСЯЛЁВА.** — З часам і новыя жанчыны прыйшлі. Вось і спяваем з тых часоў. У 2003 годзе нам далі званне «народны». Тады, дарэчы, і назву прыдумлялі і, паколькі мы з Аршанскага раёна, то вырашылі, што будзем называцца адпаведна.

Сёння тут спявае 12 чалавек. Склад пераважна жаночы, але ёсць і два мужчыны. З першага складу засталося пяць спявачак. Расповеды пра жыццё мясцовых прыхільнікаў песні, вядома, не абыходзяцца без яе выканання. Першая з пачутых — «Ой, я жала жыта пры дарозе»:

***(кожны радок паўтараецца двойчы)***

*Ой, я жала жыта пры дарозе*
*Павесіла калыску на бярозе.*
*Ой, я жала жыта пры даліне,*
*Павесіла калыску на каліне.*
*Жну й палоску, жну й другую,*
*Крычыць маё дзіцятка, а я чую.*
*Пакуль постаць падагнала,*
*А ваўчыца майго сына скрала.*
*Ой, я жала жыта пры даліне,*
*Павесіла калыску на каліне.*

Такая яна, карціна рэальнага жыцця — такога, якім яно было не так даўно. Сёння гэта ўжо толькі адгалосак мінулага. Чужому гору не дапаможаш, застаецца толькі паспачуваць. Цяжка працавалі на зямлі, якая была карміцелькай, гадавалі дзяцей, не адыходзячы ад сена, снапоў і агародаў з бульбай…

— Гэтая песня з вёскі Бабінічы. Запісалі яе ад Марыі Астапенкі, жанчыны, якой ужо, на жаль, няма. Ляжала песня запісанай гадоў дваццаць таму, а нядаўна мы ўключылі яе ў свой рэпертуар, — дзеляцца ўдзельнікі «Аршаначкі». — Увогуле, у нас у рэпертуары розныя песні ёсць. Большая частка запісана ў бліжэйшых вёсках: Антонаўка, Бабінічы, Марозава і іншых.

Як адзначаюць у калектыве, усе песні, што выконвае «Аршаначка», мясцовыя. Большасць з іх запісалі ад мясцовай жыхаркі Валянціны Германавай. І тут, мабыць, як даніну памяці захоўваюць не толькі самі творы народнай культуры, але і манеру іх выканання, не спрабуючы нічога перарабляць на сучасны лад: як пачулі, так і спяваюць.

…І ў наступных песнях — ізноў пра будні жанчын. Часам нават ніякавата робіцца, калі разумееш, якім павінна было быць жыццё, каб страціць надзею яго працягваць…

*«Ой, чырвона каліна,*
*на ўвесь свет счырванела.*
*Аддала мяне мая мамачка,*
*дзе вяліка дружына.*
*У вялікай дружыне*
*прывыкаці я буду,*
*І старэнькаму,*
*і маленькаму дагаджаці я буду.*
*Ой, пайду і зламлю я*
*ды чырвону каліну,*
*За ліхім мужам, за разбойнікам,*
*я навекі загіну.*
*Ой, пайду ж я, пайду я,*
*куды раньшэ хадзіла,*
*Ці не ўвіжу я, ці не ўбачу я,*
*каго раньшэ любіла.*
*Не зважай мяне, мама,*
*што я ў цябе адненька,*
*Завядзі мяне, утапі мяне,*
*дзе вадзіца чысценька.*
*Не зважай мяне, мама,*
*што я слаўнага роду,*
*Завядзі мяне,*
*утапі мяне ў глыбокую воду».*

Аднак, як сведчаць іншыя песні, жанчыны беларускія моцныя духам і ўмеюць супрацьстаяць жыццёвым перыпетыям. У чым часта ім дапамагала вера:

*Закурыўся дробненькі дожджык*
*каля цёмнага лесу,*
*Зажурыўся мой родненькі тата*
*маёй горкай доляй.*
*Не курыся ты, дробненькі дожджык,*
*каля цёмнага лесу.*
*Не журыся, мой родненькі татка,*
*маёй горкай долі.*
*Калі ж буду я Богу ўгодна*
*не буду галодна…*

«Аршаначка» на «Дажынках» была, на «Славянскім базары», а сёння ўжо часцей іх сустрэнеш на святах тутэйшых вёсак, а таксама як жаданых гасцей на вяселлях. Ансамбль удзельнічае ў рэгістрацыі шлюбаў з элементамі вясельнага абраду. Нам расказалі пра цікавы абрад, які называецца «Выпрабаванне маладой». На другі дзень, калі маладая прачнулася і выходзіць да сваякоў, якія сабраліся ў хаце, жанчыну жартоўна выпрабоўваюць (просяць вады нанасіць рэшатам альбо фасолю рассыпаную на падлозе пазбіраць, ці бліноў напячы), перашкаджаючы ёй пры гэтым. Калі маладая не ведае, што адбываецца, то і пакрыўдзіцца можа. У выніку ж маладыя просіць у маці дапамагчы яго жонцы і навучыць яе ўсяму, пасля чаго працягваюць гуляць вяселле. А потым — жыццё, дзе ў кожнага свае характары, свае патрабаванні. І прыжыцца ў новай сям'і, як паказваюць песні, жанчынам не заўсёды лёгка было, і не кожную, хто замуж па каханні выходзіў, шчасце чакала:

*Куры мае, куры, куры-чабатуры,*
*Дай жа, Божа,*
*мужанька да маёй натуры.*
*Каб гарэлачку не піў,*
*табаку не нюхаў,*
*Чужых жонак не любіў,*
*адну мяне слухаў…*
*Як пайшла я да кумы,*
*стала пад сцяною,*
*А мой мілы чорнабрывы*
*любіцца з кумою.*
*Кума ставіць бутылачку,*
*яшчэ свежу рыбку,*
*А я ўзяла, не сцярпела,*
*дай пабіла шыбку.*
*Прыхаджу дадому*
*з бальной галавою,*
*Павязала галовачку*
*белай хусціною…*
*Куры мае, куры, куры-чабатуры,*
*Дай жа, Божа,*
*мужанька да маёй натуры.*

Песня, выкананая на манер прыпевак, мае вясёлы матыў, аднак змест яе дакладна не з вясёлых. І ў кожнай фальклорнай кампазіцыі — не толькі адбітак часу і характару, але і свая мудрасць…

*Хаджу я, хаджу*
*па вішнёваму саду,*
*Аддала ж мяне маць*
*ды ў вялікую сям'ю,*
*А вялікая сям'я*
*ўся вячэраць пасела,*
*А мяне ж, маладу,*
*пасылаюць па ваду.*
*Я па воду пайшла,*
*я й вады прынесла,*
*А вялікая сям'я навучае мужыка:*
*«Чаму жонку не б'еш,*
*чаму волю ёй даеш?» —*
*«А за што ж яе біць,*
*яна ўмее ўсё рабіць,*
*І касіць, і варыць,*
*і са мною гаварыць».*

Праслухаўшы такія песні «Аршаначкі», і пазіраўшы за жанчынамі, якія выконваюць іх, задаешся пытаннем: а ці так і шмат змен адбылося за тыя гады, што раздзяляюць гераінь песень і сённяшніх вясковых жанчын? Адказ знайшоўся пасля знаёмства з **Надзеяй Германавай** (яна з ліку першых удзельніц калектыву)…

— Любоў да песні ў мяне ад маці. Яна пасля вайны засталася адна з пяццю дзецьмі. Мы жылі на хутары, уся гаспадарка і клопат пра нас, дзяцей, ляжалі на яе плячах. Зразумела, што мы з малых гадоў маме дапамагалі. Калі ёй было цяжка, то яна заўсёды спявала і нам казала, каб падхоплівалі. Мама ўжо дваццаць гадоў як не з намі, а я працягваю спяваць, — дзеліцца ў асабістай размове Надзея Аляксееўна. — Мой лёс склаўся нібыта лепш, хаця таксама 14 гадоў таму мужа не стала. Двое сваіх дзетак выгадавалі з ім і яшчэ дваіх узялі, калі памерла сястра мужа. Забралі, выхавалі, усім вяселлі парабілі…

Голас маёй суразмоўцы пачынае дрыжэць, а потым яна расказвае пра ўнучку, якая, пакуль не з'ехала на вучобу ў сталіцу, падзяляла бабуліна захапленне песняй. І, нібы падсумоўваючы змест уласнага жыцця і песень, якія толькі што гучалі на сцэне, кажа:

— Усе яны пра цяжкі лёс жанчыны. Гэта адбітак таго, як жылі раней. Спяваеш іх — і нібы душу адкрываеш, адпускаеш усе свае перажыванні. А там, глядзіш, ізноў настрой выдатны і табе добра… Я аптымістка, таму і трымаюся.

**Алена ДРАПКО.**

## «Аршаначка» і «Крупчаняты» загучаць па-сучаснаму

**Праект «Наперад у мінулае», які кожную нядзелю збірае прыхільнікаў беларускай народнай песні ля экранаў, зімой парадуе нас новымі вандроўкамі. Ужо 7 снежня гледачоў чакае падарожжа ў Аршанскі раён і знаёмства з творчасцю народнага фальклорнага ансамбля «Аршаначка». А 14 снежня адбудзецца экспедыцыя ў Крупкі, дзе свае таленты пакажа ўзорны фальклорны ансамбль «Крупчаняты».**

...Першыя падрабязныя пісьмовыя сведчанні пра Крупкі адносяцца да 1627 года. У архіўных дакументах згадваецца той факт, што князь Сангушка Сымон Самуэль падарыў сваёй жонцы Алене Корвін-Гасеўскай мястэчка Крупкі. Праз гэтыя землі пралягаў важны шлях — славуты Кацярынінскі тракт, ці, як яго яшчэ называлі, старая смаленская дарога. Многія вандроўнікі, дзяржаўныя дзеячы праязджалі праз гэтую мясцовасць, напрыклад, рускі выдавец М. Галавін, які адзначыў, што на шляху ад Оршы да Брэста яму ўдалося знайсці толькі адну «гасцініцу» ў Крупках.

Падчас вайны 1812 года мястэчка было спалена французскімі салдатамі. З падзеямі таго часу тут звязана адна легенда. Каля горада ёсць возера Лясное. Кажуць, што там затанула карэта Напалеона з усім багаццем. Хто ні шукаў, знайсці не змог. У канцы 1970-х гг. нават арганізавалі экспедыцыю вадалазаў, каб адшукаць скарбы. Нічога не знайшлі, але высветлілі, што возера мае двайное дно.

З Крупскай зямлёй звязана жыццё многіх славутых людзей. Так, у вёсцы Белае нарадзіўся двойчы Герой Савецкага Саюза лётчык-касманаўт СССР Уладзімір Кавалёнак. Вёска Асечана з'яўляецца радзімай пяціразовай чэмпіёнкі свету па акадэмічнай грэблі, двухразовай уладальніцы залатых медалёў Алімпійскіх гульняў Кацярыны Хадатовіч-Карстэн. У гэтым раёне пачынаўся шлях такіх беларускіх пісьменнікаў, як Міхась Калачынскі, Васіль Зуёнак, Васіль Макарэвіч, а таксама многіх іншых выдатных асоб. Калі ёсць жаданне даведацца пра гэты край больш, далучайцеся да вандроўкі з праектам «Наперад у мінулае».

Стваральнікі праграмы ўжо зрабілі добрай традыцыяй не толькі знаёміць сваіх гледачоў з песеннай творчасцю калектываў. Кожная экспедыцыя не абыходзіцца без расповеду пра мясцовыя абрады, традыцыі, паданні. А як вынік і падарункі — новыя арыгінальныя версіі аўтэнтычных песень. Шукаць натхненне ў мінулым і дзяліцца ім з намі будзе на бліжэйшых выхадных Вера Карэтнікава, а праз тыдзень удзельнікам праграмы стане фолькмедыягурт «Неруш». Цікавы вопыт для артыстаў і новыя ўражанні нам з вамі гарантаваны. Час і месца сустрэчы нязменныя, у нядзелю 7 і 14 снежня ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» у 11.25.

**Алена ДРАПКО.**


# СА «ЗВЯЗДОЮ» — У НОВАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ!

Падчас правядзення чарговай рэкламнай гульні «Звязда» разыграе сярод падпісчыкаў **лічбавыя тэлевізійныя рэсіверы** і суперпрыз — **тэлевізар LG з дыяганаллю 99 см.**

Што трэба для таго, каб выйграць? Як заўсёды — падпісацца на газету на 1-ы квартал альбо 1-е паўгоддзе і, запоўніўшы картку ўдзельніка гульні, даслаць яе ў рэдакцыю (падрабязная інфармацыя аб правілах — у нумары за 26 лістапада).





**Для тых, хто ўжо вырашыў жыць са «Звяздой», але на новы год пакуль не падпісаўся, — маленькая падказка: зрабіце гэта цяпер, бо якраз з _1 па 15 снежня_ ўсім індывідуальным падпісчыкам прапануюцца зніжкі: кошт падпіскі на месяц будзе складаць 56 150 беларускіх рублёў.**

**Зніжкі — і ў гэты ж час — прапануюцца і на іншыя выданні Выдавецкага дома «Звязда»: на газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Алеся», «Бярозка», «Вожык», «Маладосць», «Нёман», «Полымя», «Родная прырода».**

***Заставайцеся са «Звяздой»!***

**2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2015 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ на І кв. або 1–е паўг. 2015 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______________

______________________________________________

______________________________________________

Удачы ў розыгрышы!

# СУБОТА, 13 СНЕЖНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.45** Існасць.
**7.10** Слова Мітрапаліта Паўла на дзень памяці Апостала Андрэя Першазванага.
**7.20 Меладрама «Ён, яна і я».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 23.40 Серыял «Цуд». 1-я серыя.**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** Кулінарная дыпламатыя.
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.45** Ток-шоу «Здароўе».
**13.25** Беларусь LIFE.
**13.50** «Зорнае жыццё». «Якія пайшлі ў 2012 годзе».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30, 0.50** «Вялікая розніца».
**17.20 Меладрама «Іншая жанчына». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Алібі — надзея, алібі — каханне».**
**0.40** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**6.45 Фільм-казка «Салавей».**
**8.10** Толькі для дарослых.
**8.25** М/с «Аватар: Легенда пра Аанга».
**8.55** Беларуская кухня.
**9.35, 21.15** Тэлебарометр.
**9.40** Анімацыйны фільм «Гнамеа і Джульета».
**11.05, 21.20 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**12.15** Капейка ў капейку.
**12.55** Біятлон. Этап кубка свету. Эстафета. Жанчыны.
**14.25** «Бітва экстрасэнсаў».
**15.55** Вось гэта дзіва!
**16.25** Біятлон. Этап кубка свету. Эстафета. Мужчыны.
**18.00** «Comedy woman».
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** Ікра.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Спортлато 6 з 49.
**21.05** КЕНО.
**22.30** «Сустрэча з ...» Аляксандр Ткачонак.
**23.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.45, 15.40, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.55, 15.50** «Музычны скарб Беларусі».
**8.20 «Плач пералётнай птушкі». Драма.**
**9.30** «Камертон». Народны артыст Расіі, рэжысёр Маскоўскага тэатра на Паўднёвым Захадзе Валерый Беляковіч.
**9.55** «Маё кіно. Валерый Панамароў».
**10.20 «Траянскі конь». Камедыя.**
**12.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.05 «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў». Камедыя.**
**14.10 «Залатавалоска». Музычная казка.**
**16.00** «Музеі Беларусі». Музей гісторыі слуцкіх паясоў.
**16.20** «Сяргей Рагожын. З музыкі і святла...». Дак. фільм.
**16.50 «Рудольфія». Кароткаметражны фільм.**
**17.10** Святочны канцэрт, прысвечаны заснаванню Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.
**18.35** «Дыя@блог P.S.».
**19.00 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**20.45** Калыханка.
**21.20 «Уся каралеўская раць». Драма.**
**23.25** «Зорку за сцінгер». Дак. фільм.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**8.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Авангард» (Омская вобл.).
**10.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Спрынт. Жанчыны.
**12.20** Піт-Стоп.
**12.50** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**13.20** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
**15.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**18.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестар» — «Манчэстэр Сіці».
**20.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.
**20.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Нексе» (Харватыя) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
**22.35** Формула-Е. Гран-пры Уругвая.
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Ньюкасл».

## АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50 Драма «Джэйн Эйр».**
**15.15** «Рассмяшы коміка».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Вялікія гонкі».
**17.50** «100 мільёнаў».
**18.45** Нацыянальная музычная прэмія «Ліра».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.50** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**0.50 Камедыя «Сястрычкі Бэнгер».**

## СТБ

**6.20 Серыял «Студэнты 2».**
**7.10 Камедыя «Шалёныя грошы».**
**9.05** «Чыстая праца».
**10.00** «Іншая краіна». «Зроблена ў Кітаі».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.40 Маст. фільм «Гэта жанчына ў акне...».**
**15.20** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** «Сляды багоў».
**18.25** «Разумней не прыдумаеш». «Белы сезон».
**20.00** «СТБ спорт».
**20.10 Трылер «Уцякач».**
**22.30** «Зорны рынг. Бітва хітоў». «ReDISCO» і Аляксандра Кастэнка супраць «Tomato Jam».
**23.45 Маст. фільм «Чаму мужчыны ніколі не слухаюць, а жанчыны не ўмеюць паркавацца».**
**1.30** «Глядзець усім!».

## МІР

**6.00** М/ф.
**7.45** «Зямля і неба».
**8.10** «Саюзнікі».
**8.35** «Сабака ў доме».
**9.00** «Эксперыментатары».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.40 Маст. фільм «Куфар Марыі Медычы».**
**12.15 Серыял «Партыя для чэмпіёнкі».**
**15.25** «Сабака ў доме».
**16.15 Серыял «Справа была на Кубані».**
**23.35 Маст. фільм «Блізнюк».**
**1.30 Маст. фільм «Гары, гары мая зорка».**
**3.10 Маст. фільм «Волга-Волга».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.50 Маст. фільм «Яго каханне».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.25 Маст. фільм «Ніколі не размаўляйце з невядомымі».**
**14.15 Серыял «Мора па калена».**
**16.10** М/ф.
**16.20** «Гэта смешна».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** «У жыцці раз бывае 60!». Юбілейны канцэрт Ігара Крутога. Частка другая.
**22.55 Маст. фільм «Калі яго зусім не чакаеш».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**16.25** «Афганцы».
**17.05** «Кантрольны званок».
**18.00** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.10** «Ты не паверыш!».
**22.15** «Ген п'янства».
**23.30 Серыял «Каўбоі».**
**1.05** «Мужчынская годнасць».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 13.25, 19.00, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**9.05** Тэлепрагноз.
**9.10** «Мультпарад».
**9.25 Серыял «Лялечны дом».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Трылер «Дні мінулай будучыні».**
**13.30 Трылер «Законапаслухмяны грамадзянін».**
**15.20** «Кінаблакнот».
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.35 Камедыя «Формула кахання».**
**18.10 Серыял «Эўрыка».**
**19.05 Трылер «127 гадзін».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Саветнік».**

## ВТБ

**6.00, 6.00** "PLAY".
**8.00** "Галоўныя людзі».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Сябры на кухні».
**12.30** Серыял «Карклёк — птушка пеўчая».
**15.00** Баявік «13-ы раён».
**17.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**17.30** «Уральскіх пельмені».
**19.00** Скетчком «Сям'я 3D».
**20.30** Драма «Бунтарка».
**23.30** «Без вежы».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі ХЭ».
**5.00** «Спаткане з густам».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Маст. фільм «Будні і святы Серафімы Глюкінай».
**12.25** Дак. фільм «Аліса Фрэйндліх. Няма тлумачэння ў цуду».
**13.15** Вялікая сям'я. Барыс Шчарбакоў.
**14.10** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «Нефрантавыя нататкі».
**14.35** Да 80-годдзя з дня нараджэння Віктара Папова. «Пра час і пра сябе».
**15.15** Канцэрт Вялікага дзіцячага хору УДТРК. Маст. кіраўнік Віктар Папоў.
**15.45** Дак. фільм «Імяслаўскія спрэчкі. З гісторыі рускага манаства на Афоне».
**16.30** Успамінаючы Аляксандра Патапава. Спектакль Малога тэатра «Рэвізор».
**19.40** Да 90-годдзя з дня нараджэння акцёра. «Радж Капур. Таварыш бадзяга».
**20.20** Фільм-легенда «Бадзяга».
**23.10** «Белая студыя». Рэйф Файнс.
**23.50** Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Снягі Кіліманджара».
**1.50** М/ф для дарослых «Камунальная гісторыя».
**1.55** Дак. фільм «Тайна белага ўцекача».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Відавочнае—неверагоднае». 1983 год.
**7.15** Фільм-канцэрт «Мелодыі і рытмы маладосці». 1980 год.
**7.40** Тэлеспектакль «Алена і Штурман». 1992 год.
**8.40** М/ф «Кошчын дом».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 5.00** «Песня-90».
**12.00** Дак. фільм «Камунальна».
**13.00** «Спявае Валерый Лявонцьеў». 1988 год.
**13.30** Тэлефільм «Следства вядуць знаткі». 1982 год.
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1981—1988 гадоў.
**18.00** «Ранішняя пошта». 1988 год.
**18.30** «Што? Дзе? Калі?». 1990 год.
**20.05** «Аўтапартрэт. Лілія Амарфій». 1986 год.
**21.00** Мюзікл «Тайна Снежнай Каралевы». 1-я серыя.
**22.20** «Добрай ночы», цёткі і дзядзькі!». Незвычайнае навагоднае шоу. 1990 год.
**23.10** «Музыка ў эфіры». Зоркі англійскага рока. 1994 год.
**0.00** «Камера глядзіць у свет». 1984 год.
**1.15** Канцэрт замежнай эстрады.
**1.40** Тэлеспектакль «Дон-Карлас». 1980 год. 2-я частка.

## EUROSPORT

**3.15** WATTS.
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыйны раўнд.
**11.15, 14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**12.30, 15.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**13.00** Біятлон. Кубак свету. Жаночая эстафета.
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета.
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**20.00** Конны спорт. Ла Карона.
**22.15, 2.00** Конны спорт. Скачкі.
**22.30** Снукер. Еўрапейскі тур.
**2.15** Настольны тэніс.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.05, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.55** Прыгоды «Фантамас».
**8.40** Камедыя «Госць».
**10.35, 14.30, 17.30, 22.00** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**11.00** Камедыя «Закахацца ў нявесту брата».
**12.45** Мюзікл «Двайныя непрыемнасці».
**15.20** Камедыя «Па той бок».
**17.05, 20.00, 21.45, 22.50, 0.55, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**18.20** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**20.20** Камедыя «Дом з прыколамі».
**23.10** Камедыя «Высакашаноўны джэнтльмен».
**1.15** Камедыя «Ізноўгуд, або Каліф на гадзіну».
**4.00** Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00, 5.15** «Дом дагары нагамі».
**11.00** «Хронікі маскоўскага быту».
**11.55** «Гісторыі выратавання».
**12.30** Маст. фільм «Нябесныя ластаўкі».
**15.00, 1.50** Дак. фільм «Аляксандр Малінін. Голас душы».
**16.35** «Свая праўда».
**17.40** Дак. фільм «Так рана... Так позна».
**19.15** «Даўно не бачыліся!».
**20.30** Маст. фільм «Неадэкватныя людзі».
**22.30** Маст. фільм «Забойствы ў Оксфардзе».
**0.20** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**3.05** Маст. фільм «Нябесныя ластаўкі».

## ТБ1000

**6.10** Камедыя «Голы кароль».
**8.10, 2.00** Баявік «Легенда Зора».



**10.30** Баявік «Каралі Дагтаўна».
**12.30** Драма «Калі я памірала».
**14.30** Камедыя «Парыж—Манхэтэн».
**16.05** Драма «Марыя-Антуанета».
**18.15** Драма «Глыбокае сіняе мора».
**20.00** Камедыя «Кошкі-мышкі».
**22.05** Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
**23.55** Трылер «Невідзімка».
**4.30** Камедыя «Сцюарт Літл 2».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Сіндром шахматыста».
**10.10** М/ф «Пра Фядотастральца, удалога малайца».
**11.40** Камедыя «Саламяны капялюшык».
**14.20** Прыгоды «Вяртанне мушкецёраў, або Скарбы кардынала Мазарыні».
**16.50** Камедыя «Навагодняя жонка».
**18.35** Камедыя «Практыкаванні ў выдатным».
**20.20** Драма «Старэйшая жонка».
**22.30** Камедыя «Лёгкі на паміне».
**0.40** Камедыя «Ёлкі 3».
**2.15** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**4.45** Меладрама «Прагулка».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**7.00** Старацелі.
**8.00** Незвычайныя здабычы.
**9.00** Навука будучыні.
**10.00** Космас: Прастора і час.
**11.00** Гульня ў лікі.
**12.00** Больш чым фокусы.
**13.00** Нямецкая армія Чэрчыля.
**14.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**15.00** Палярны мядзведзь.
**16.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**17.00** Суперзбудаванні.
**18.00** Навуковыя недарэчнасці.
**21.00, 1.00, 4.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'ядала.
**23.00, 3.00** Кіраванне натоўпам.
**0.00** Картачны фокуснік.

## DISCOVERY

**8.00** Як гэта ўстроена?
**8.25, 15.35** У пагоні за класікай.
**9.15** Аляска: сям'я з лесу.
**10.10, 3.40** Голыя і напалохавыя.
**11.05** Дамы на дрэвах.
**12.00, 7.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.50, 22.00** Склады: бітва ў Канадзе.
**13.45, 6.10** Дарога да прыбытку.
**14.40** Хуткія і гучныя.
**16.30** Легендарны аўтамабіль.
**17.25** Поўны фарсаж.
**23.00** Дзённікі вялікай вайны.
**0.00** Трой.
**1.00** Як уладкаваны Сусвет.
**1.55** Як пабудаваць суперкар.
**2.50** Каралі сталярнай справы.
**4.30** Стальныя мышцы.
**5.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.45** Як гэта зроблена?

## ■ А вы ведалі?

# 75 ГАДОЎ ЗАХАПЛЕННЯ



**У канцы восені 1939 года ў Нью-Ёрку адбылася падзея, якая перавярнула жыццё прадстаўніц прыгожага полу. Сусветна вядомы хімічны канцэрн DuPont прэзентаваў новы сінтэтычны матэрыял — нейлон. Не прайшло і года, як у продажы з'явіліся панчохі з нейлону, а былыя фаварыты — тэхнічна недасканалыя шаўковыя панчохі — сышлі ў нябыт. З таго часу прайшло 75 гадоў, а панчохі і цяпер займаюць важнае месца ў жаночых гардэробах і фантазіях мужчын.**

У лабараторыях DuPont у 1938 годзе скончылася распрацоўка новага сінтэтычнага матэрыялу, якая суправаджалася актыўнай рэкламнай кампаніяй. Вынайдзены Улесам Каразэрсам нейлон здзейсніў прарыў у тэкстыльнай галіне. У выніку кампанія DuPont, супрацоўнікам якой быў гэты вучоны, узбагацілася на мільярды долараў.

Трэба сказаць, з'яўленне такога тавару выклікала ў амерыканак каласальную цікавасць, але ў першыя месяцы панчохі былі даступныя толькі для супрацоўніц кампаніі-вытворцы. Раней панчохі выраблялiся з натуральнага шоўку, і ў рамках магутнай рэкламнай кампаніі сенсацыйнай навінкі амерыканкам тут жа тлумачылі: «Насіць панчохі з шоўку замест нейлонавых — гэта ўсё роўна, што аддаць перавагу каню замест аўтамабіля». І сапраўды, у адрозненне ад шаўковых, нейлонавыя панчохі добра цягнуліся, не гублялі формы, не спаўзалі і не моршчыліся, вытрымлівалі пераносілі мароз і вільгаць. Хіба маглі жанчыны ўстаяць?

Упершыню нейлонавыя панчохі паступілі ў продаж у канцы кастрычніка ў адным з універмагаў Вілмінгтона (штат Дэлавэр), стварыўшы неверагодны ажыятаж сярод пакупніц, хоць і каштавалі ўдвая даражэй за шаўковыя. А продажы панчох у Амерыцы пачаліся 15 мая 1940 года, справакаваўшы гіганцкія чэргі. Некаторыя шчаслівыя ўладальніцы навінкі надзявалі тут жа на вуліцы. Толькі за першы дзень у Нью-Ёрку прадалі 780000 пар. Да канца 1940 года аб'ём продажу дасягнуў 3 мільёнаў пар, прычым попыт прыкметна пераўзышаў прапанову.

У 1941 годзе ў сувязі з патрэбамі Другой сусветнай вайны вытворчасць нейлону накіравалі на выраб парашутаў, адзення і розных матэрыялаў для арміі. Нейлонавыя панчохі сталі вялікай рэдкасцю. Аднак жаданне жанчын прытрымлівацца моды і выглядаць эфектна аказалася мацней за



цяжар падзей тых гадоў, і было знойдзена выйсце: панчохі можна было… маляваць! Іх рабілі з дапамогай лаку, а цёмны аловак вымалёўваў знакамітае «шво ззаду». Менавіта той выпадак, калі «прыгажосць патрабуе ахвяр», а таксама часу і спецыяльных навыкаў. Лак для гэтых мэт адпаведна, выраблялі ў прамысловых маштабах. Пасля заканчэння вайны ўвосень 1945 года «рэвалюцыйны тавар» зноў з'явіўся ў крамах, і зноў жанчыны гадзінамі стаялі ў чэргах, каб яго набыць. Таксама для продажу панчох сталі з'яўляцца спецыяльныя аўтаматы, якія прадстаўніцы прыгожага полу палічылі геніяльным вынаходніцтвам.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**




**Центр Промышленной Оценки**

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Трест Белтрансстрой» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже следующего имущества:**

**ЛОТ № 1: изолированное помещение** административного назначения, инвентарный номер **100/D-64620, общ. пл. 447,2 кв.м,** расположенное по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, **г. Брест, ул. Менжинского, д. 30,** в т.ч. компьютерная сеть, теплосчетчик ТЭМ-05м-1 ДУ 32; теплосчетчик ТС-05. **Начальная цена с НДС – 3 208 632 000 бел. руб.**

Объекты недвижимости (Лоты №№ 2–6), расположенные по адресу: г. Брест, ул. Карасева, 100:

**ЛОТ № 2: Повышенный путь** (протяженность 355,1 м), инвентарный номер 100/С-60978 (в т.ч. верхнее строение пути, бетонная площадка, подпорная стена, ж/б забор). **Начальная цена с НДС – 6 294 150 720 бел. руб.**

**ЛОТ № 3: Здание административно-хозяйственное** (бытовые помещения на 90 человек), общ. пл. 410,7 кв.м; инв. № 100/С-47319. **Начальная цена с НДС – 1 942 393 920 бел. руб.**

**ЛОТ № 4: Механическая мастерская, общ. пл. 968,5 кв.м, инв. № 100/С-47329** (в т.ч. покрытие из бетонных плит, ограждение из ж/б плит на ж/б столбах, покрытие бетонное, ограждение из ж/б плит, трое металлических ворот). **Начальная цена с НДС – 2 233 584 960 бел. руб.**

**ЛОТ № 5: Гараж автоколонны, общ. пл. 798,2 кв.м (в т.ч. покрытие бетонное, эстакада монолитная ж/б), инв. № 100/С-47340; Здание для хранения материалов (кладовки), общ. пл. 200 кв.м, инв. № 100/С-47334. Начальная цена с НДС – 2 630 118 720 бел. руб.**

**ЛОТ № 6: Помещение хозяйственного назначения, общ. пл. 34 кв.м, инв. №: 100/С-73106. Начальная цена с НДС – 143 797 440 бел. руб.**

**ЛОТ № 7: Здание склада металла, общ. пл. 208,3 кв.м,** инвентарный номер 350/С-46920; **здание прирельсового склада, общ. пл. 348,6 кв.м,** инвентарный номер 350/С-46921, расположенные по адресу: **г. Гомель, ул. Шоссейная, 9. Начальная цена с НДС – 240 922 109 бел. руб.**

*Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».*

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Рэспубліка» от 31.10.2014 (Лоты №№ 1–6); в газете «Звязда» от 12.11.2014 (Лот № 7).

Оплата за предмет аукциона (лот) производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, который должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **15.12.2014 г.** в **9.30** по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.12.2014 г.** до **17.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.**

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

## Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»

**16 декабря 2014 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**
**Начало работы собрания в 13.30.**

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.30 до 13.30.

Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 09 декабря в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О создании унитарного предприятия.

УНП 200075434

*Наблюдательный совет.*

Белинвестбанк

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 октября 2014 г.

Наименование банка: ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 878 016 | 938 440 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 975 | 4 772 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 791 444 | 2 722 421 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 475 989 | 777 879 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 970 286 | 3 145 393 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 17 106 487 | 15 012 883 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 449 013 | 799 701 |
| 9 | *Инвестиции в зависимые юридические лица* | | | 79 637 | 78 419 |
| 10 | *Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица* | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 415 | 1 915 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 851 894 | 1 700 596 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 7 853 | 1 094 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 15 | *Деловая репутация* | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 330 908 | 277 555 |
| 17 | **ИТОГО активы** | **11** | | **28 948 917** | **25 461 068** |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 219 755 | 1 188 160 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 3 912 871 | 2 798 734 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 20 119 883 | 16 818 588 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 792 205 | 1 039 247 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 15 | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 525 238 | 441 685 |
| 26 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **25 569 967** | **22 286 414** |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 1 167 408 | 1 167 408 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 124 413 | 115 843 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 1 144 994 | 1 148 303 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 941 372 | 742 655 |
| 33 | **ВСЕГО собственный капитал, принадлежащий головной организации - банку** | | | **3 378 187** | **3 174 209** |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 763 | 445 |
| 35 | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **3 378 950** | **3 174 654** |
| 36 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **28 948 917** | **25 461 068** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## на 1 октября 2014 г.

Наименование банка: ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 2 552 778 | 1 981 895 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 898 606 | 1 465 008 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 654 172 | 516 887 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 566 105 | 461 599 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 110 541 | 85 079 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 455 564 | 376 520 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 321 | 774 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 18 512 | 4 310 |
| 9 | Чистый доход от операций с иностранной валютой | 205 | | 51 634 | 54 026 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 76 347 | 32 257 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 146 094 | 61 941 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 206 486 | 194 926 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 920 176 | 743 605 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 93 182 | 105 497 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 303 584 | 268 657 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 33 160 | 32 451 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **270 424** | **236 206** |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 2 722 | 964 |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | **Итого прибыль (убыток)** | | | **273 146** | **237 170** |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 272 827 | 236 493 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 319 | 677 |

**Председатель Правления** **Г. А. Сысоев**

**Главный бухгалтер** **А. Н. Сырокваш**

**http://www.belinvestbank.by/bank-profile/key_performance_indicators/nsfo/quartelly_consolidated/**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3, выдана Национальным банком Республики Беларусь 3 июня 2013 г. УНП 807000028*

146

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29.

**www.belinvestbank.by**

■ З людзьмі і сам-насам

# «КОЖНЫ ГОД ДА НАС ПРЫХОДЗІЦЬ НОВЫМ, АДЫХОДЗІЦЬ ЗМРОЧНЫМ І СТАРЫМ»

**З класікам не паспрачаешся: моцна сказана! І ўсё ж — трохі сонца. Адкуль? Ды, відаць, як заўжды, — з жыцця: пра зямное і вечнае, мінулае і будучае, аб праблемах быцця і лёсе мовы разважаюць чытачы «Звязды».**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

«Назіраю за жыццём і думаю: што гэта робіцца з нашымі людзьмі, чаму яны так прагнуць грошай? — *піша спадарыня* ***Лідзія ЛУК'ЯНАВА з вёскі Швабы Лагойскага раёна***. — Ну вядома ж, добра калі яны ў чалавека ёсць, калі ў сям'і пануе дабрабыт. Тады што хочаш — еш, што хочаш — пі, хадзі ў госці, куды хочаш, едзь на адпачынак, купляй дарагія машыны, радуйся жыццю, і ўсё тут. Але ж ці настолькі магутныя тыя грошы? Ці адкупіўся імі хоць хто-небудзь ад смерці, ад цяжкай невылечнай хваробы? Не? Значыць, не яны тое галоўнае, на што трэба класці жыццё, за што трэба трымацца ў абедзве рукі, а тым больш ісці на злачынствы...».

«Некалі вяселлі рабілі сціплыя, — *узгадвае чытачка*, — маладым дарылі па пяцёрцы ці па дзясяціцы рублёў альбо нейкі адрэз тканіны, і тыя былі рады. Пажаніўшыся, жылі ў каханні ды згодзе ўсё жыццё, колькі яго адмерана. А паглядзіце цяпер, што робіцца на вяселлях: збіраюцца дзясяткі, а то і сотні людзей, дорацца мільёны рублёў ды тысячы долараў. А потым, развёўшыся праз месяц-другі, маладыя не могуць падзяліць «набыткі».

Дарэчы, некалі даўно, падчас час вяселля маёй стрыечнай сястры, у пары гасцей (мужа з жонкай) згарэла хата. Дык тая нявеста (сама круглая сірата — бацька яе загінуў на фронце, маму з маленькай сястрычкай спалілі фашысты) сабрала ўсё, што ім падарылі, і занесла пагарэльцам. Думаю, ну хто б з маладых сягоння, хочучы ўсяго і адразу, зрабіў бы вось гэтак? Мусіць, няма такіх?»

«Паглядзіш на людзей, — *працягвае Лідзія Паўлаўна*, — дык і не бедныя яны, і не галодныя, і прыгожа апрануты, а ў галовах ўсё роўна — грошы, грошы, грошы... Мы, ветэраны, нейк пражылі свае гады без гэтых долараў. Сумленна працавалі, гадавалі дзяцей, і ўсе былі нейкія роўныя. А сёння ў многіх па некалькі дамоў і кватэр, па некалькі дарагіх аўтамабіляў, а ўсё роўна мала. Тэлевізар хоць ты не ўключай: за тыя клятыя грошы чаго толькі ні робіцца: людзі забіваюць адно аднаго, брат на брата з нажом ідзе...

А недзе ляжаць прыкаваныя да ложкаў дзеткі-інваліды, якім патрэбна дапамога, недзе хворыя, адзінокія... Дык чаму б не дапамагчы ім, чаму на вось гэта шкада сваіх грошай? А так жа быць не павінна. Па сабе ведаю: калі аддасі што, дапаможаш у нечым бліжнейшаму, дык сабе ж і радасць. Паспрабуйце! Бо ў жыцці чалавека, — піша напрыканцы *спадарыня Лук'янава*, — не грошы галоўнае, а здароўе ды спагада».

*Нельга не пагадзіцца з Лідзіяй Паўлаўнай. І, вядома ж, чытаючы ліст яе, нельга не ўзгадаць сумна вядомыя залатыя батоны ды ўнітазы, убачаныя па тым жа тэлевізары, адмысловыя пакоі (з лазенькамі, з гардэробнымі!) для ўлюбёных... сабачак, шматлікія палацы, дзе раскашуюцца па два-тры чалавекі...*

*А паблізу, магчыма, і напраўду гора. І дапамагчы ў ім няма каму.*

«Дзеля чаго мы прыходзім у гэты свет? — *пытае спадарыня* ***Надзея ДАДЗЬКОВА з Мсціслаўшчыны*** *і сама ж адказвае*: — каб выканаць сваё прызначэнне. На жаль, не кожны можа і хоча ісці дарогай святла і любові, але ж кожны марыць адчуваць гэтае святло ды любоў, цяпло родных душ. Мне пашанцавала ў зямным жыцці, я нарадзілася ў веруючай праваслаўнай сям'і, прабабуля, бабуля, дзядуля і мама змаглі раступмачыць мне вялікія ісціны: любі Госпада і зямлю, на якой нарадзілася; не крыўдзі бліжняга, таму што ён, як і ты, дарагі Госпаду; годна нясі свой крыж, не спрабуючы перакласці яго на нечыя плечы.

На жаль, не так лёгка трымацца гэтых вось правілаў, але, дзякуй Богу, імкненне такое ёсць».

«У нашы дні, — *разважае Надзея Рыгораўна*, — часта пішуць і гавораць аб адраджэнні духоўнасці. Для душы і сапраўды патрэбны малітва, чытанне Святога Пісання, добрыя справы. А яшчэ трэба навучыцца аналізаваць свае ўчынкі, бачыць, дзе і што мы зрабілі няправільна: каго асудзілі, падманулі, абгаварылі і г.д. Неабходна ведаць, што ўсё дрэннае (нават думкі) апаганьваюць нашу душу, што яна, як і цела, патрабуе ачышчэння — шчырай споведзі ў храме. Праз святара Бог адпусціць нашы грахі, дасць сілы, каб жыць далей...»

«Мой ліст — гэта заклік да веры ў Бога, да выратавання», — *піша напрыканцы Надзея Рыгораўна*.

*Да яго ж, да вырватавання, заклікае і спадарыня* ***Галіна ЖУРАЎЛЁВА з вёскі Ліпаў Калінкавіцкага раёна***. «Не магу спакойна глядзець на ўтрыманцаў, на дармаедаў, на тых, хто не хоча працаваць. Пісала пра іх і дэпутатам, і ў Міністэрства сацыяльнай абароны, прыводзіла прыклады з жыцця нашых бацькоў. У іх час амаль ніякіх дапамог ад дзяржавы не было, вялікіх дэкрэтных адпачынкаў не давалі таксама. Усе людзі стараліся працаваць. У нашай сям'і, напрыклад, гадавалася чацвёра дзяцей, і заўсёды была вялікая гаспадарка: каровы, свінні, качкі, гусі, куры. Уся гэтая жыўнасць вымагала догляду, а таму не толькі дарослыя, але і мы, малыя, мелі ў сям'і пэўныя заняткі, пэўныя абавязкі. Нам не было калі блытацца без справы ды шукаць сабе нейкіх прыгод».

«А сёння, — *працягвае Галіна Рыгораўна*, — наша кіраўніцтва трохі разбэсціла людзей. Дапамогі нейкія прыдумалі, дзіцячыя грошы... Ды бацькам-гультаям яны толькі на радасць. Ім цяпер ні каровы, ні курэй — нічога не трэба! Ім можна нідзе не працаваць, адно — піць ды гуляць. Чаму б не, калі ў школе іх дзяцей бясплатна вучаць, бясплатна кормяць, у гуманітарку апранаюць...

Цікава, і да чаго мы так дажывёмся?

Альбо вазьміце тых, хто ездзіць за мяжу на заробкі. Я нічога супраць не маю, людзі малайцы, стараюцца, працуюць, зарабляюць грошы. Няхай сабе і там... Але тут, на мой погляд, яны павінны плаціць падаткі, бо іх дзеці бясплатна вучацца ў школах, карыстаюцца медыцынскімі і іншымі паслугамі, якія фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту...»

«За ўсё трэба плаціць. Нічога бясплатнага быць не павінна! Як па-мойму, дык нават сацыяльных пенсій, — *перакананая спадарыня Жураўлёва*. — Бо за што іх даваць? За тое, што чалавек нідзе не працаваў?

У народзе кажуць: няма роду без выроду. Так і ў нас: усякіх людзей хапае. Але ж трэба нейк змагацца з гультаямі. Тады і працавітым будзе лягчэй. А інакш мы ніколі не будзем багатымі».

«Не падумайце, — *напрыканцы ліста дадае Галіна Рыгораўна*, — мой клопат не пра сябе (я ўжо на пенсіі), а за дзяцей, за ўнукаў, за ўсіх працавітых людзей».

*Акурат такі ж самы «клопат не пра сябе», «прадыктаваў» ліст і спадарыні* ***Веры ЦЕРАХАВАЙ з вёскі Магілёўцы Пружанскага раёна***. «Мне ўжо за 80, — паведамляе яна. — Вы хочаце сказаць, што я — аднакласніца Ілы Мурамца? А мне ўсяго 20, астатняе стаж. Старасці ў палон я не здаюся, яшчэ працую, і праца мяне грэе не матэрыяльнай аплатай, а зносінамі з людзьмі, магчымасцю шмат чытаць, у тым ліку і газет. Мне падабаецца «Звязда». Яна шмат піша аб праблемах адукацыі, аб стане роднай мовы. Уразілі словы: «Наша бяда ўжо не ў тым, што дзеці не могуць ці не жадаюць размаўляць на беларускай мове. Сітуацыя нашмат горшая: яны ўжо страцілі здольнасць да беларускага вымаўлення».

Мне захацелася пагадзіцца з гэтаю думкай і дадаць, што сітуацыя пагаршаецца яшчэ і таму, што ў наша жыццё ўрываецца засілле замежных слоў, *піша Вера Віктараўна*. З кожным днём, на мой погляд, нарастаюць патокі з *«аўдытаў», «лізінгаў», «ф'ючараў», «свінгаў»*... Раней адбываліся *сустрэчы*. Цяпер — *брыфінгі* ды *раўты*. Былі *кавалеры*, цяпер *бой-фрэнды*. У адной з газет убачыла здымкі абутку з надпісамі. Дык вось: тое, што раней было *чаравікамі* і *туфлямі*, цяпер стала нейкімі *брогамі* і *монкамі*... Як на мой погляд, назіраецца не толькі няўменне размаўляць з людзьмі на зразумелай ім мове, але і непавага да іх.

Згодна, мы не павінны глуха замыкацца ў рамках свайго слоўніка, трэба папаўняць яго, але ж ведаючы меру».

«На мой погляд, у пытаннях мовы мы павінны заставацца дзецьмі сваёй Айчыны, — *сцвярджае спадарыня Церахава. І нагадвае*: — «Памятаеце, у адной з казак народны герой, страціўшы мову, фактычна загінуў... Да жыцця яго вярнула жывая вада з родных крыніц. Вельмі хочацца спадзявацца, што мы не знямеем, не загінем, як нацыя, што мову сваю захаваем».

*І, магчыма, сумесным клопатам усіх, каму гэта баліць, захаваем газету — адзіную (са штодзённых) беларускамоўную, амаль стагадовую, родную...*

«Я нарадзіўся ў 1923 годзе ў вёсцы Бабаевічы Клецкага раёна Баранавіцкай вобласці, якая да 17 верасня 1939 года была пад Польшчай, — *чытаем у лісце заслужанага настаўніка БССР* ***Івана АПАНАСЕВІЧА з Магілёва***. — Бацькі мае былі непісьменнымі. Маці замест подпісу ставіла крыжык, бацька мог чытаць па складах. Я скончыў сем класаў польскай школы, але беларускую мову вучыў толькі ў першым класе, адзін год, потым яе адмянілі, нягледзячы на тое, што амаль усе вучні былі беларусамі. Нас хацелі апалячыць...»

*Пасля ў жыцці шаноўнага Івана Адамавіча была руская школа, політэхнічны інстытут, праца ў Магілёўскім будаўнічым тэхнікуме — жыццё ў рускамоўным, трэба разумець, асяроддзі. Але, нягледзячы на гэта, у сям'ю заўсёды прыходзіла «Звязда». Чаму?*

«Таму, што я, — *піша спадар Апанасевіч*, — беларус, і мова мая — беларуская. Я чытаю і выпісваю менавіта гэтую газету, каб помніць мову сваіх бацькоў, каб перадаваць яе сваім дзецям і ўнукам...»

*Разам з чарговым лістом — падарунак: так званая «шапка» звяздоўскага нумара за 20 кастрычніка... 1993 года!* «...Шукала сярод сваіх выразак рэцэпт ад адной хваробы, — *піша спадарыня* ***Вера ЛОЙКА з Дзяржынска***, — і знайшла вось гэту газету. Лепшую частку яе адсылаю вам, разам са сваімі прызнаннямі ў любові... Я штодня чакаю прыходу «Звязды», з цікавасцю яе чытаю. І буду выпісваць, буду чытаць, пакуль глядзіць мае вочы...».

«Выбачайце за маё пісьмо, — *дадае напрыканцы Вера Аляксандраўна*, — бо чалавек я ўжо не малады і рэдка што пішу. А вам як змагла, так напісала, на беларускай мове, бо я таксама яе люблю».

*Няма за што прабачацца нашым шаноўным падпісчыкам, бо ўсё ў іх лістах — як трэба! Яны добрыя і шчырыя, яны прасякнуты клопатам (не столькі пра сябе), у іх — жаданне падзяліцца назапашанай мудрасцю і жаданне па-ранейшаму нешта рабіць для таго, каб жыла краіна і ў ёй — мова.*

*А далей уявіце, што было б, калі б кожны, хто лічыць сябе беларусам, па-беларуску стаў размаўляць... Чытаць... Думаць... Каб таму ж стаў вучыць дзяцей...*

*Вы лічыце, што справа не ў мове? А ў чым? Напішыце. Гэты ж агляд рэдакцыйнай пошты хацелася б завяршыць тым, з чаго пачалі: радкамі з верша, напрыканцы якога слынны Пімен Панчанка піша:*

*...Ад нявер'я і тугі не плачу,*
*Веру:*
*Дабрыня людская ёсць —*
*Толькі ў працы з поўнаю аддачай*
*І ў каханні шчырым і гарачым,*
*І ў вачах даверлівых дзіцячых,*
*Дзе яшчэ не начавала злосць.*

**Валянціна ДОЎНАР**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЧУЖЫЯ ФОТА

Ці варта разам з памяццю аб колісь блізкім чалавеку выкрэсліваць памяць роду?

Прыяцельцы не тое што пашчасціла — такая ўдача падваліла, што ўсе, нават добразычліўцы, зайздросцяць зусім не белай зайздрасцю. Атрымала ў сталіцы жылплошчу, як кажуць, «на халяву». Чаго ёй гэта каштавала? Звычайнай чалавечай спагады і нераўнадушша. У старым «хрушчоўскім» доме, на ціхай невялікай вуліцы ля парка Чалюскінцаў, дзе яны з мужам здымалі кватэру з адзіным прахадным пакоем і мікраскапічнай кухняй, на першым паверсе ў гэткіх самых «апартаментах» жыў Мікалай Іванавіч. Былы супрацоўнік Акадэміі навук, ён дажываў век, паглыбіўшыся ў сваю старэчую адзіноту, у паўцёмным ад вялізных кустоў бэзу і язміну ля пад'езда пакоі, сярод шматлікіх кніжак ды дварових катоў, якія ўлетку падымаліся да яго ў кватэру па дошцы, выкінутай з акна, і з якімі дзяліўся сваім небагатым харчам. Ці была калі ў Мікалая Іванавіча сям'я, дакладна ніхто не ведаў. Казалі, нібы па маладосці ажаніўся, хутка развёўся, і жонка з дзіцем з'ехала да сваіх бацькоў, перарваўшы з былым мужам усялякую сувязь.

Апошнія гады ён быў такі нямоглы, адзінокі, што маладая суседка проста не магла праходзіць міма. То дапаможа торбачку паднесці, то сама ў магазін збегае, купіць старому якога кефіру, а за свае грошы яшчэ і трохі смакаты прыбавіць, то катоў яго любімых падкорміць. Сусед аказаўся надзвычай цікавым субяседнікам, і яна за звычку ўзяла забягаць да яго на пагутаркі на чай... Карацей, калі Мікалая Іванавіча з цяжкім інсультам забрала «хуткая», уранку з бальніцы пазванілі менавіта ёй. Дзядок назваў гэты нумар як тэлефон сваякоў на выпадак, калі штосьці здарыцца.

Хавалі Мікалая Іванавіча ўсім домам. Шукаючы патрэбныя дакументы, знайшлі ў камодзе тэлефонны нумар Гомеля з пазнакай «дачушка». Але на пахаванне ні «дачушка», ні хто іншы са сваякоў не прыехаў, хоць нумар аказаўся правільным, на тым канцы провада паведамленне аб смерці роднага чалавека сустрэлі раўнадушным маўчаннем. «Нічога, дойдзе, што кватэра засталася, — прыпруцца як міленькія», — злосна перагаворваліся паміж сабой суседкі.

Памыліся бабулі. Высветлілася, што Мікалай Іванавіч пра завяшчанне паклапаціўся і пакінуў кватэру з усёй яе амаль антыкварнай маёмасцю Марыне — той самай маёй прыяцельцы, якая яго ў апошнія гады дагледзала. Які гэта ажыятаж выклікала ва ўсім доме і нават у суседніх — размова асобная. Але мае знаёмыя, якія ўжо каторы год не вельмі вынікова спрабавалі сабраць грошы хоць на які ўласны куток, разважылі, што на чужы рот гузіка не нашыеш, і пачалі рыхтавацца да наваселля.

Кватэра была не тое што запушчаная — патрабавала капітальнага рамонту. Мэбля ж не падлягала ніякай рэстаўрацыі, ёй была адна дарога на сметніцу. Паважаючы памяць старога добрага чалавека, новая гаспадыня не стала выкідваць усе паперы, а перагледзела кожную. І знайшла — сапраўдны скарб для любога сучаснага чалавека, які цікавіцца гісторыяй свайго роду. Таму што дзядуля з сапраўднай скрупулёзнасцю вучонага-хіміка склаў «формулу»-радавод. Не толькі з «галінкамі» генеалагічнага дрэва (карані якога сягалі аж у шаснаццатае стагоддзе!), але і з апісаннем лёсаў асобных яго персанажаў, з цытатамі з архіваў, не толькі нашага, але і віленскага, і ленінградскага. Прыяцелька, знайшоўшы такое багацце, проста ахнула. Мы з ёй цэлы вечар тады сядзелі ў пустым пакоі на засыпанай тынкоўкай падлозе, разглядаючы тыя паперы. А калі разгарнулі старыя фотаальбомы ў палінялых аксамітавых вокладках — і наогул знямелі. Фота там былі — вы не паверыце — з тых самых часоў, як з'явілася сама фатаграфія. Асветленыя нейкай узвышанай прыгажосцю твары, якія бываюць толькі на старых здымках, глядзелі праз стагоддзе задумліва і пранікнёна. Былі тут і дамы ў шырокіх капелюшах, і барадатыя купцы, і сур'ёзныя мужчыны ў скураных паліто, і вайсковец з «лычкамі» лейтэнанта, і прыгажуні пасляваенных пары ў плюшавых футрачках «пад коціка»... Гісторыя абсалютна чужой сям'і нечакана ўварвалася ў думкі і ўражанні, са сваімі дэталямі і прыглушанымі чорна-белымі фарбамі.

Марына назаўтра пазваніла па ўжо вядомым гомельскім нумары — не тое што дзеля ачысткі сумлення. Мы былі ўпэўнены, што, якія б там адносіны са старым прафесарам ні складваліся ў яго родных, магчымасць забраць такую патрэбную кожнаму чалавеку спадчыну яны не ўпусцяць. Трубку зняла дарослая ўнучка Мікалая Іванавіча, як падалося, вельмі зацікавілася і абяцала абавязкова прыехаць.

Было гэта ўлетку. Я пра тую гісторыю ўжо і думаць забылася і, нават калі перазвоньваліся ці сустракаліся з прыяцелькай, не цікавілася, ці прыязджала тая жанчына. А пазаўчора Марына пазваніла з навіной: тая ўнучка ў выхадныя з'явілася. Агледзела кватэру, чмыхнула штосьці кшталту «пасквапіўся дзядуля». Без асаблівай цікавасці праглядзела фота, спынілася толькі на здымку самога Мікалая Іванавіча: аказваецца, дзеда яна ніколі ў жыцці не бачыла. Рукапісны архіў нават не прагартала да канца, адклала ўбок. Зацікавілася толькі старой, пэўна, з пачатку 1950-х, настольнай лямпай: маўляў, павінен жа быў ён і мне нешта пакінуць. Хутка засунула яе ў сумку і падалася прэч. На пытанне Марыны, што рабіць з паперамі і альбомамі, раўнадушна пацiснула плячыма.

«І вось што мне цяпер з гэтым архівам рабіць? — роспачна пытала сяброўка. — Выкінуць рука не падымаецца, а трымаць дзесьці на антрэсолях чужыя жыцці таксама не вельмі добра». «Хай паляжаць. Можа, тыя, гомельскія, адумаюцца», — парада, калі яе давала, здавалася такой слушнай і адзіна правільнай. А зараз вось думаю: наўрад ці...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**Отдел принудительного исполнения Минского района**
**16 декабря 2014 года в 10.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 119а-236**
**ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО РЕАЛИЗАЦИИ:**

## • Незавершенного не законсервированного капитального строения и земельного участка

**для строительства и обслуживания жилого дома с кадастровым номером 623680604101000096 общей площадью 0,0911 га, расположенных по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Подгорная, принадлежащих на праве собственности Куприянову Сергею Александровичу.**
**Начальная стоимость 513 920 000 рублей.**

*Для участия в торгах необходимо внести задаток на депозит ОПИ Минского района (ГУЮ Миноблисполкома, Ф-л ОАО БАПБ, МОУ код 942, р/с 3642911400010, УНП 600013502, назначение платежа 05520) в размере 51 392 000 рублей до 15 декабря 2014 года включительно.*

По всем вопросам обращаться в отдел принудительного исполнения Минского района по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 119а-236, тел.: 223 68 32 (раб.), 8 029 1472069 (моб.).

УНП 600013502

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**Отдел принудительного исполнения Минского района**
**17 декабря 2014 года в 10.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 119а-236**
**ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО РЕАЛИЗАЦИИ:**

## • Земельный участок

**с кадастровым номером 623684000034000085, площадью 0,1000 га, расположенный в СТ «Рябиновка», Лошанского с/с Минского района, принадлежащего на праве частной собственности Дармелю Владимиру Николаевичу.**
**Начальная стоимость 36 476 900 рублей.**

*Для участия в торгах необходимо внести задаток на депозит ОПИ Минского района (ГУЮ Миноблисполкома, Ф-л ОАО БАПБ, МОУ код 942, р/с 3642911400010, УНП 600013502, назначение платежа 05520) в размере 3 647 690 рублей до 16 декабря 2014 года включительно.*

По всем вопросам обращаться в отдел принудительного исполнения Минского района по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 119а-236, тел. 2236832 (раб.), 8 029 1472069 (моб.).

УНП 600013502

15 декабря 2014 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1».

Повестка дня:

1. О переизбрании членов совета директоров.

Местонахождение ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 05.12.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНН 200215539

В **суд Шумилинского района Витебской области** поступило заявление об объявлении умершим гражданина ГОЛУБЕВА Дмитрия Сергеевича, 11 ноября 1972 года рождения, уроженца г.п. Шумилино Витебской области, последнее известное место жительства г.п. Шумилино, ул. Луначарского, д. 15 Витебской области. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, которые имеют сведения о Голубеве Дмитрии Сергеевиче, сообщить их суду Шумилинского района Витебской области по адресу: г.п. Шумилино, ул. Короткина, д. 13, в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Трест Белтрансстрой» (продавец)**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА,

**расположенных по адресу:**

## г. Гомель, ул. Шоссейная, 9:

**Здание гаража**, общ. пл. **887 кв.м**, инвентарный номер: 350/С-110902 (стены – кирпичные, ж/б колонны; перекрытия – ж/б плита по ж/б фермам; крыша – совмещенная; полы – бетонные, дощатые; 1977 г.п.; h-6.90; есть бытовые помещения, санузел, смотровые ямы).
**Здание проходной,** общ. пл. 9 кв.м, инвентарный номер: 350/С-110905 (стены кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, полы бетонные, крыша совмещенная).
**Здание склада ГСМ,** общ. пл. 66 кв.м, инвентарный номер: 350/С-110910 (стены, перегородки – кирпичные; перекрытия – сборные ж/б плиты, крыша – совмещенная).
**Мойка автомобилей и очистные сооружения,** инвентарный номер: 350/С-46919 (площадь застройки 146,0 кв.м, состоит из операторской, очистных сооружений, площадки для мойки машин).

**Начальная цена с НДС – 3 473 876 880 бел. руб.**

Объекты недвижимости расположены на земельном участке пл. **0,8901 га,** предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания гаража, здания проходной, мойки автомобилей и очистных сооружений, здания склада ГСМ.
*Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».*
Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, который должен быть подписан в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **09.01.2015 г. в 10.00** по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.01.2015 г. до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**
**www.cpo.by E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ГРОДНЕНСКАЯ ОБУВНАЯ ФАБРИКА «НЕМАН»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот № 1** | | |
| **Наименование предмета торгов, краткая характеристика** | **Изолированное помещение с инв. № 400/D-150913** (столовая), 2 этажа, железобетонный каркас с железобетонными панелями, общей площадью 2953,9 кв.м, 1977 г.п. В изолированном помещении часть площадей (920,3 кв.м) сдается в аренду: арендатор ООО «МаТиЗ», договор аренды до 01.12.2018 года. | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., г. Гродно, ул. Гагарина, д. 41-1 | | |
| **Информация о земельном участке** | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,4389 га с кадастровым номером 440100000001000524, назначение – для эксплуатации и обслуживания здания столовой | | |
| **Начальная цена** | **12 187 200 000 рублей с учетом НДС** | **Сумма задатка 3%** | **365 616 000 рублей** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 95, тел. 8(0152) 52 04 00 | | |
| **Сведение об организаторе торгов** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | |
| **Номер счета организатора торгов для перечисления задатка** | р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Торги состоятся 23 декабря 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **по 17 декабря 2014 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 772379, 744911 | | Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» № 192 от 09.10.2014 г., № 216 от 14.11.2014 г. | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 06 января 2015 года ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ по продаже имущества, принадлежащего ОДО «Виталюр»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | **«А 1/к Склад» общей площадью 965 кв.м, инвентарный номер 500/С-61233 (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности: навес (1), гаражи (2, 3, 4, 5), мощение, ворота, забор)** |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,2376 га, кадастровый номер 500000000004000303 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Вильямса, 47 |
| **Сведения о продавце** | ОДО «Виталюр», АБК, к. 1, 9-й км Московского шоссе, 223010, Минский район |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 7 500 000 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 750 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОДО «Виталюр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **06 января 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 08.12.2014 по 05.01.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36, (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017) 266-06-59 (ОДО «Виталюр»).**

16 декабря 2014 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 09.12.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЙ И СООРУЖЕНИЙ ОАО «Кричевцементношифер»

**Начальная цена продажи объекта снижена на 49%.**

| |
|---|
| **Лот № 1.** Административно-производственный корпус (цех деревообработки) (инв. № 00110089), асфальтная площадка (инв. № 00220182), изгородь (инв. № 00220068), здание цеха пилорамы (инв. № 00110095), здание гаража (инв. № 00110092), здание металлического склада (инв. № 00110096), здание столярного цеха, здание гаража, наружное освещение (инв. № 00110091). |
| **Характеристика объектов:** Административно-производственный корпус (цех деревообработки) (инв. № в ЕГРНИ 730/С-185, общая площадь 2990,8 кв.м, объем 19488 куб.м, фундамент бутовый, стены кирпич, перекрытия ж/б, имеются водопровод, канализация, отопление), асфальтная площадка (инв. № в ЕГРНИ 730/С-13317, общая площадь 5472 кв.м), изгородь (инв. № в ЕГРНИ 730/С-13316, забор кирпичный (длина-высота, м) 12,3 х 1,8, 16,5х2,40; забор ж/б плиты 104х2,10; забор металлические прутья 3,2х2,7; ворота металлические длина 6м), здание цеха пилорамы (инв. № в ЕГРНИ 730/С-16260, общая площадь 456,7 кв.м, объем 2926 куб.м, фундамент бетонный, стены панели, перекрытия ж/б), здание гаража (инв. № в ЕГРНИ 730/С-322, общая площадь 238,2 кв.м, объем 1034 куб.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия ж/б), здание металлического склада (инв. № в ЕГРНИ 730/С-16262, общая площадь 187,5 кв.м, объем 802 куб.м, фундамент бетонные тумбы, стены металл, крыша жесть), здание столярного цеха, здание гаража, наружное освещение (инв. № в ЕГРНИ 730/С-353, общая площадь 647,2 кв.м, объем 2632 куб.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия ж/б). |
| Площадь земельного участка 2,1282 га, кадастровый номер 724050100001000161 предоставлен в постоянное пользование, целевое назначение – земельный участок для обслуживания существующих зданий. |
| Объект продается без условий. |
| Начальная цена продажи 2 425 118 544 (Два миллиарда четыреста двадцать пять миллионов сто восемнадцать тысяч пятьсот сорок четыре) рубля с учетом НДС 20%. |
| Сумма задатка **242 511 854** (Двести сорок два миллиона пятьсот одиннадцать тысяч восемьсот пятьдесят четыре) рубля. |

Аукцион состоится **15 декабря 2014 г. в 15.00** по адресу: Кричевский район, Краснобудский сельсовет, 2 АБК в районе месторождения «Каменка», актовый зал.

Продавец объекта – ОАО «Кричевцементношифер».

Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка».

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № 3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 12.12.2014 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников 15.12.2014 с 14.00 до 14.45 по месту проведения аукциона.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Кричевцементношифер» не позднее 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00. Контактный телефон продавца в г. Кричеве 8 044 715 94 24. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.

*Извещение об аукционе напечатано в газете «Звязда» 10.10.2014 № 193 (27803).*

■ Падзея

# Сярод лясоў наднарачанскіх

## Помнік Максіму Танку адкрываецца сёння ў Мядзеле



**Першы ў Беларусі помнік Максіму Танку адкрываецца 5 снежня на плошчы імя Шаранговіча ў горадзе Мядзел. Скульптурная кампазіцыя ўяўляе сабой бронзавую фігуру паэта ў поўны рост на гранітным пастаменце. Побач — валун з выявай у выглядзе разгорнутай кнігі з выбітымі радкамі з верша паэта «Ёсць адна песня песняў — пра Радзіму».**

Конкурс на стварэнне эскізных праектаў помніка быў аб'яўлены ў 2012 годзе да 100-годдзя з дня нараджэння паэта. Лепшымі прызнаны работы скульптараў Івана Міско і Аляксандра Фінскага і архітэктара Армэна Сардарава.

У гэты дзень беларускія творцы, прадстаўнікі грамадскасці і ўлады наведаюцца ў вёску Новікі, каб ушанаваць памяць паэта. Тут, на старых могілках, Максім Танк пахаваны разам са сваёй вернай спадарожніцай жыцця — жонкай Любоўю Андрэеўнай. Не абмінуць госці і музей Танка ў Сваткаўскай сярэдняй школе. Абноўленая экспазіцыя прысвечана жыццёваму і творчаму шляху песняра. Тут сабраны рэдкія выданні кніг паэта, разнастайныя дакументы, фотаздымкі, а таксама прадметы сялянскага побыту.

У Мядзельскім гарадскім Доме культуры адбудзецца паэтычная гасцёўня «Усё ўзяла душа без берагоў» з удзелам прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў Беларусі. У фае райвыканкама прысутныя азнаёмяцца з выставай з фондаў Музея гісторыі беларускай літаратуры, а таксама паслухаюць канцэрт у выкананні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Жыновіча.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

Даты | Падзеі | Людзі **5 СНЕЖНЯ**

**1914** год — 100 гадоў таму нарадзіўся (вёска Сяліба, цяпер Бярэзінскі раён) Рыгор Няхай, беларускі пісьменнік. У 1939 годзе скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя», Дзяржаўным выдавецтве БССР. Аўтар паэтычных зборнікаў «Маё пакаленне», «Вялікі мой і ціхі акіян», аповесцяў «Героі не адступаюць», «Туман над стэпам» і іншых. Пісаў таксама для дзяцей, працаваў як перакладчык. Памёр у 1991 годзе.



**1945** год — у раёне Бермудскага трохвугольніка ў паўночнай Атлантыцы бясследна зніклі пяць самалётаў-тарпеданосцаў. Палёт авіязвяна з пяці паветраных машын пачаўся ў 14.00, а ў 15.15, пасля адпрацоўкі вучэбна-баявога задання, самалёты ўзялі курс на сваю базу Форт-Лодэрдэйл на паўвостраве Фларыда. Раптам кіраўнікі палёту пачулі дзіўнае паведамленне ад камандзіра авіязвяна лейтэнанта Чарльза Тэйлара: «Здаецца, мы збіліся з курсу! Зусім не бачу зямлі!». На прапанову дыспетчара ляцець на захад, каб выйсці са славеснага «трохвугольніка», Тэйлар адказаў: «Мы не ведаем, дзе захад! Складваецца ўражанне, што і акіян выглядае неяк незвычайна!». Паколькі радыёсувязь перарвалася, на дапамогу церпячым бедства паспяшаўся выратавальны гідрасамалёт «Марцін Марынер», але і ён знік гэтак жа нечакана! Выходзіць, што ўсяго за некалькі гадзін амерыканскія ваенна-паветраныя сілы страцілі шэсць самалётаў і 27 чалавек вывучанага персаналу, прычым без усялякіх відавочных прычын! Анамальная зона і сёння лічыцца адным з самых загадкавых месцаў на планеце.

**1949** год — 65 гадоў з дня нараджэння (г. Мінск) Уладзіміра Васільевіча Магільнага, беларускага фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук (1998). У 1972 годзе скончыў БДУ, працуе ў ім. Аўтар навуковых прац па працэсах пераўтварэння аптычных уласцівасцяў малекулярных ансамбляў і рэгіструючых асяроддзяў пад дзеяннем аптычнага выпраменьвання, стварэнню і эксперыментаму вывучэнню новых палімерных фотарэгіструючых матэрыялаў для запісу рэльефных, фазавых і палярызацыйна-фазавых малюнкаў.

**Было сказана**

**Алесь РАЗАНАЎ, паэт, перакладчык:**

*«Такое маўчанне ў снезе, такая далеч, такая бель — што замірае душа: не ўмее яна ячшэ быць такой».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.10 | 16.49 | 7.39 |
| Віцебск — | 9.07 | 16.32 | 7.25 |
| Магілёў — | 9.00 | 16.39 | 7.39 |
| Гомель — | 8.49 | 16.44 | 7.55 |
| Гродна — | 9.24 | 17.06 | 7.42 |
| Брэст — | 9.17 | 17.15 | 7.58 |

## Месяц

*Поўня 6 снежня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Аляксея, Максіма, Міхаіла, Паўла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара.*
*К. Хрысціны, Генрыха.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА









## УСМІХНЕМСЯ

**У наш час сучасных тэхналогій навучыліся рабіць настолькі выдатныя дзіцячыя цацкі, што з дзіцячых крам з крыкамі і скандаламі сталі выходзіць не толькі дзеці, але і іх бацькі.**

— Як лепш прыгатаваць перапёлак?
— А колькі іх у цябе?
— Адна.
— Аддай кату, ён разбярэцца.

**Каб быць геніяльным урачом, як доктар Хаус, патрэбны веды і сарказм. Для працы ў раённай паліклініцы хопіць сарказму.**

— Што такое верх аптымізму?
— Сказаць: «Пайду зайду на хвілінку ў паліклініку».

**Пакуль я не заспела мужа з палюбоўніцай, свята верыла ў тое, што нельга біць ляжачых, голых і нагамі...**

З дзяцінства яна марыла пра шыкоўныя дарагія аўтамабілі і багатых мужчын, якія б прыносілі ёй пачкі грошай.

Вырасла, і яе мара спраўдзілася — яна касір у аўтасалоне.

**У цырульню ўвальваецца моцна зарослы мужык:**

**— Падстрыжыце, як у мінулы раз!**

**Цырульнік:**

**— Гэта не да мяне, я тут усяго год працую.**



caricatura.ru

**НАРОДЖАНЫЯ 5 снежня**

**Гэтыя людзі перакананы ў тым, што ажыццявяць запланаванае, што яны здольны на грандыёзныя здзяйсненні. Аднак ім вядомыя і паражэнні. Яны шчыра зацікаўлены тым, што робяць у гэты момант, і шчодра падзяляюць вынікі сваёй працы. Большасць з іх параўнальна вольныя ад клопатаў і сумненняў, якія звычайна не даюць спакою іншым людзям. Ім неабходна засвоіць правіла, што думкі іншых людзей таксама штосьці значаць. Абавязковай умовай развіцця асобы тых, хто нарадзіўся ў гэты дзень, павінна стаць выпрацоўка цвёрдага і рэалістычнага ўяўлення аб сваім месцы і мэце свайго жыцця. Пакуль гэтага не адбудзецца, яны будуць заўсёды вагацца і сумнявацца, і, нягледзячы на ўласцівы ім аптымізм, іх будуць суправаджаць расчараванні.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.149. Індэкс 63850. Зак. № 4875.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 снежня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12